ПРАЛЕТАРЫ ЎСІХ КРАЁЎ, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

ЗЬВЯЗДА

№ 128 (3236) Субота, 8-га Чэрвеня 1929 г.

Орган Цэнтральнага і Менскага Камітэтаў Камуністычнай Партыі (б) Беларусі.

Адрас рэд. і канторы: Менск, Савецкая, 63
ШТОДЗЕННАЯ ГАЗЭТА, ГОД ВЫДАНЬНЯ XIII
Тэлефоны: рэдактар—1074, сакратар—619, кантора—781

ГАДЫ ПОЧЫ:

НЬЮ-ЁРК, 7. Амэрыканска-расійская гандлёвая палата паведамляе, што ў склад прамысловай дэлегацыі ПАЗШ, якая накіроўваецца ў СССР, увайшлі, пакуль што, 50 прадстаўнікоў ад банкаў і прамысловых прадпрыемстваў. Усе ўдзельнікі дэлегацыі зьбяруцца ў Бэрліне і адтуль 15 ліпеня выедуць у Маскву

НАВІНЫ Б. С. С. Р.

БАБРУЙСК, (Наш кар.). У акрузе пачаліся торфараспрацоўкі. За бягучы сэзон мяркуецца здабыць каля 31 т. тон торфу. 17 тыс. тон пойдзе на угнаеньне сялянскіх палёў.

Наказ новаму прыказчыку

„НЯ ЎЗДУМАЙ ТОЛЬКІ НАС ЧАПАЦЬ“

Ангельская буржуазія навучае Макданальда

Але дарэмныя надзеі Макданальда. Англія ўступіла ў такую гістарычную паласу, **калі нават адносны часовы і сацыяльны мір немагчымы. Беспрацоўе, як саркома, разьядае сацыяльны арганізм. Пагроза рэвалюцыйнага павароту ў масах вельмі рэальная.** Становішча на замежных рынках, якое азначае агульны стан імпэрыі—надзвычайна цяжкае. У інтарэсах буржуазіі патрэбна рашучая, бязьлітасная рацыяналізацыя прамысловасьці капіталістычнымі мэтадамі і зьніжэньне сабекошту за кошт далейшага зьніжэньня жыцьцёвага ўзроўню пралетарыяту. Пры сучасных настроях ангельскага рабочага, такі паварот багаты для буржуазіі вялікімі небясьпекамі. Вось чаму частка буржуазіі прытрымліваецца таго пункту гледжаньня, што лепш перадаць лейцы на час Макданальду і зрабіць буржуазную справу рукамі «рабочае» партыі. Гэту місію Макданальды і Сітрыны на сябе бяруць ахвотна. Лібэральная буржуазія пры гэтым, аднак, разважае, што калі маўр зробіць сваю справу, яму можна будзе запрапанаваць «адпачынак». Буржуазія, аднак, прадстаўляе сабе будучае разьвіцьцё надзвычайна аптымістычна. Мільёны рабочых, якія на працягу доўгіх год знаходзіліся ў палоне самай рэакцыйнай ангельскай партыі,—у кансэрватараў,—ад яе адыходзяць. Гэта—факт буйнейшае палітычнае важнасьці. Можна прадбачыць, што падобна 1924 г., зноў у Англіі ў выніку прыходу да ўлады ілжэрабочага ўраду, мы ўбачым пэўны ўздым актыўнасьці рабочае клясы. Забастовачны рух можа ўзмацніцца, клясавыя супярэчнасьці будуць абвастрацца. І чым хутчэй яны будуць, тым шпарчэй будзе адбывацца самавыкрыцьцё Макданальдаўскага ўраду, як агэнтуры буржуазіі, якая імкнецца падпіраддкаваць пралетарыят рэжыму ўзмоцненай рацыяналізатарскай эксплёатацыі ў горшых яе капіталістычных формах. Зразумела, гэтага ня прыходзіцца чакаць адразу, як толькі да ўлады прыйшоў Макданальд. Першы час ён зможа падкупіць рабочых дробнымі рэформамі, якія ня будуць падрываць ня толькі буржуазнага ладу, але і буржуазнага бюджэту. Сюды-ж далучаецца магчымае наладжаньне адносін з СССР, на што раней ці пазьней нашоў-бы і чыста буржуазны ўрад у Англіі. Ва ўсякім разе пасьля прахаджэньня другога курсу Макданальдаўшчыны, ангельскі пралетарыят стане больш сьвядомым, чым пасьля вывучэньня кароткатэрміновага першага курсу.

(«ПРАВДА»).

БУРЖУАЗНЫ ДРУК НАВУЧАЕ МАКДАНАЛЬДА

ЛЁНДАН, 6. Ангельскі буржуазны друк дагэтуль насылае лісьлівыя, салодкія фразы на адрасу ўраду рабочае партыі, заяўляючы, што яму «дасьцца магчымасьць сумленна» праяўляць сваю дзейнасьць. Аднак, у газэтных перадавіцах выразна чуцен тон грознага папярэджаньня Макданальду, якому рэкамэндуецца рухацца павольна і дзейнічаць з вялікай умеранасьцю».

Калі-ж буржуазныя газэты дакранаюцца пытаньня аб становішчы ў горнай прамысловасьці, дык яны амаль пераходзяць да простых пагроз, заяўляючы, што «усякая спроба адпавіць 7-гадзінны рабочы дзень пад зямлёю пацягне за сабою катастрофу».

Лібэралы за неадкладнае аднаўленьне адносін з СССР

ЛЁНДАН, 6. Лібэральны орган фінансавых колаў «Фінансьвель Ньюс», прызначаючы пажаданым аднаўленьне англа-савецкіх эканамічных адносін, заяўляе, што гэтаму павінна папераджаць «здавальняючая згода» па пытаньнях аб царскіх даўгох. Лібэральная «Манчэстэр Гардыян», наадварот, лічыць, што Макданальд павінен неадкладна аднавіць нармальныя зносіны з СССР і піша:

«Савецкіх дыплёматаў у Англіі трэба сустракаць на тых-жа самых умовах, як і дыплёматаў усякай іншай краіны. Няма ніякіх падстаў для якога-б там ні было торгу. Пытаньне аб прадстаўленьні пазыкі СССР павінна разглядацца выключна па сутнасьці камэрцыйнага, а не палітычнага пункту погляду. Зусім лішні які-небудзь дагавор, або згода, якая абавязвала-б СССР ня ўмешвацца ў нашы ўнутраныя справы. Калі будзе якое-небудзь умяшаньне з боку СССР, тады пра гэта і трэба будзе гаварыць».

«Манчэстэр Гардыян» заяўляе, што новы ўрад павінен неадкладна адклікаць ангельскае акупацыйнае войска з Рэйнскае вобласьці. «Гэта будзе азначаць, — піша газэта, — пачатак новага курсу замежнае палітыкі і паслужыць надхняючым сыгналам для прыяцеляў міру ва ўсіх краінах». Далей газэта падкрэсьлівае, што адзіная «Антанта, якая мысьліма для Англіі, гэта — англа-амэрыканская Антанта».

МАКДАНАЛЬД—АБ РАЗБРАЕНЬНІ МАЛЫХ ДЗЯРЖАЎ

ВАРШАВА, 6. «Роботнік» зьмяшчае гутарку свайго лёнданскага карэспандэнта з Макданальдам, які між іншым дакрануўся пытаньня аб разбраеньні малых дзяржаў.

Макданальд заявіў:

«Я не хацеў-бы ствараць уражаньня ўмяшаньня ва ўнутраныя справы іншых дзяржаў, але я лічу, што для малых дзяржаў разбраеньне зьяўляецца лепшай гарантыяй міру. Колькі-б малыя дзяржавы ни траілі грошай яны ніколі ня змогуць узброіцца настолькі, каб супроцьпаставіць сябе вялікім дзяржавам. Таму яны кідаюць грошы на вецер».

ДРУГІ КУРС МАКДАНАЛЬДАЎШЧЫНЫ

У Англіі да ўлады прышоў рабочы ўрад. На чале рабочага ўраду стаў адзін з буйнейшых лідэраў другога Інтэрнацыяналу. А біржа надзвычайна спакойная. Банкі ня ўстрывожаны пэрспэктываю ўраду рабочае партыі («Таймс»). Гэта—вельмі шляхэтны джэльтмэн, салёны «сацыялісты», які аб кіруючай клясе не забываецца». «Карона зьяўляецца сымбалем усяго народу» у выглядзе «трепетного благоговения», вернападданьніцкіх пачуцьцяў,—кажа афіцыйны орган рабочае партыі «Дэйлі Гэральд». І верны лепшым традыцыям ангельскага манархічнага рытуалу, правадыр «рабочай» партыі, прымаючы даручэньне аб утварэньні габінэту, з вялікаю пашанаю цалуе руку манарху.

Нішто не пагражае з боку новай кіруючай партыі Вялікабрытанскай імпэрыі, якая сымбалізуецца тэй-жа каронай. Вялікабрытанская імпэрыя, пабудаваная на эксплёатацыі пралетарыяту, рабаўніцтве і прыгнечаньні сотняў мільёнаў, калёніяльных рабоў-індусаў, эгіпцян, арабаў, нэграў—імпэрыя, якая адыгрывае ролю сусьветнага жандара, называецца ў праграме гэтае партыі 2-га інтэрнацыяналу «сутварэствам» нацый. І нихай толькі паспрабуе які не-будзь прыгнечаны народ пакінуць гэта сутварэства, і Макданальд будзе гаварыць з ім на мове ультыматумаў, як ён ужо гаварыў у 1924 годзе з Індыяй і Эгіптам, а калі будзе патрэбна,—і моваю гармат і бамбамётаў. Непарушнасьць прыватнай уласнасьці і ўсе сыстэмы эксплёатацыі чалавека чалавекам, непарушнасьць імпэрыі—вось асноўнае і рашаючае ў праграме той ілжэ-рабочай партыі, якая стала цяпер на чале ўлады ў Англіі. Недарма кансэрватыўны «Дэйлі Тэлеграф» (31-га мая) гіранічна піша пра Макданальда і яго прыхільнікаў:

«Яны досыць рэзка нападалі на ўрад і ліберaлаў, але калі гутарка заходзіла пра сацыялізм, іх голас далей шэпту ня ішоў. Ніхто з усіх, хто прыслухаўся ў выбарныя дні да сацыялістычных прапаведнікаў, не паверыць, што яны калі небудзь сур'ёзна былі абернуты ў марксыстых, і калі небудзь прапаведвалі клясавую сьвядомасьць».

Французкае агэнцтва «Алянс Эканомік Фінансіэр» супакойваючы біржавыя колы, пісала: «Новая практыка сацыялізму, разбаўленая ружовай палітыкай, не прадстаўляе нічога пагражаючага».

ЧЭХА-СЛАВАКІЯ і СССР

ПРАГА, 6. Міністр замежных спраў Бэнэш выступіў з вялікім дакладам па пытаньнях замежнае палітыкі як у сэнацкай камісіі па замежных справах, так і ў такой-жа камісіі палаты дэпутатаў. Дакрануўшыся ў гэтым дакладзе пытаньня аб узаемаадносінах паміж дзяржавамі Малой Антанты і СССР Бэнэш заявіў, што ў даным пытаньні дзяржавы Малой Антанты застаюцца на ранейшай лініі, намечанай некалькімі папярэднімі канфэрэнцыямі, г. зн. «кожная з дзяржаў Малой Антанты захоўвае за сабою свабоду чыннасьці» у пытаньні ўзаемаадносін з СССР.

Спрэчкі па дакладу Бэнэша адбыліся пакуль што толькі ў сэнацкай камісіі. Нацыянал-дэмакрат Брабец выступіў пры гэтым супроць наладжаньня нармальных зносін з СССР, «пакуль там ня зьменіцца становішча». Брабецу супярэчылі ў сваіх выступленьнях чэскі сацыял-дэмакрат Віт і нямецкі сацыял-дэмакрат Гелер. Абодвы прамоўцы, даводзячы патрэбнасьць нармальных дыплёматычных зносін з СССР, падкрэсьлівалі, што буйныя чэха-славацкія прадпрыемствы «вядуць вялікія справы з СССР і ім патрэбна прававая база для экспарту».

* * *

ПРАГА, 6. Лева-буржуазная газэта «Лідове Новіны», абгаварваючы ў перадавіцы пытаньне аб крэдытаваньні Чэхаславацкага вываязу, гіранічна адносіцца да анты-савецкіх заяў міністра гандлю Новака, які чакае пакуль у Крамлі сядзе «белы цар». Газэта заяўляе, што Чэха-Славакія, разьвіваючы свой вываз, павінна ў першую чаргу накіраваць увагу на Балканы і на савецкі рынак.

У фашысцкай Польшчы

Чарговы выпад пілсудзкага па адрасу сойму

ВАРШАВА, 6. Закончылася сьледства па справе былога польскага міністра фінансаў Чэховіча, які абвінавачваецца ў перавыдаткаваньні 560 мільёнаў злотых, бяз ведама сойму. Чэховіча будзе судзіць Вярхоўны Трыбунал.

Пілсудзкі адмовіўся выступаць сьведкаю па гэтай справе і зьвярнуўся ў Вярхоўны трыбунал з лістом, дзе адзначае, што ён лічыў першы сойм «зусім не аўтарытэтным, у якім панавала разлажэньне, і які ня варт вырашаць важныя дзяржаўныя пытаньні» і таму не прадставіў перавыдаткаваньня на зацьверджаньне. Разам з гэтым Пілсудзкі адзначае, што новы сойм ня менш агідны, як і ранейшы. Пілсудзкі прызнае, што ён не зварачаў увагі на паказаньні парушэньняў законаў. З 8.000.000 злотых, якія, як падазраюць, былі затрачаны ўрадам на выбары, 5.000.000 былі затрачаны Чэховічам на загаду Пілсудзкага. (Загад Чаховічу быў перададзены ў пісьмовай форме).

НОВЫЯ АНТЫСЭМІЦКІЯ І СУПРОЦЬ-УКРАІНСКІЯ ВЫСТУПЛЕНЬНІ Ў ЛЬВОВЕ

ВАРШАВА, 6. Учора ў Львове адбылося некалькі студэнцкіх дэманстрацый з патрабаваньнем вызваленьня студэнтаў-хуліганаў, арыштаваных за ўдзел у яўрэйскім пагроме. Як паведамляе бундаўская «Фолкс-Цайтунг», дэманстранты несьлі плякаты з заклікамі зьбіваць ня толькі яўрэяў, але і украінцаў «у імя выратаваньня Польшчы». Дэманстранты павыбівалі шыбы ў украінскім каапэратыве, а потым у арганізаваным парадку расхаджвалі па гораду на працягу двух гадзін, зьбіваючы яўрэяў, што пападаліся ім па дарозе.

Прафэсары Львоўскага унівэрсытэту зьвярнуліся да саюзу адвакатаў з прапановаю ўзяць на сябе абарону арыштаваных дзбашыраў. Гэту прапанову саюз адвакатаў адхіліў.

Яўрэйскія грамадзкія арганізацыі ў Львове ахоўваюцца паліцэйскімі патрулямі. Яўрэйскае насельніцтва баіцца паўтарэньня пагрому. «Газэта Варшаўска» цалкам становіцца на бок хуліганаў.

Пілсудчыкі ўсяляк стараюцца адмежавацца ад львоўскіх падзей, заяўляючы, што яны былі справакаваны «ворагамі дзяржавы», якія хацелі дыскрэдытаваць Польшчу за-граніцай».

Дэманстрацыі украінскіх сялян супроць румынізацыі

ВЕНА, 6. Як паведамляюць з Бухарэсту, у многіх мясцох Букавіны ў апошні час адбываліся дэманстрацыі украінскае меншасьці супроць палітыкі румынізацыі. У некаторых мясцох украінскія сяляне занялі румынскія школы, зьнялі румынскіх настаўнікаў і назначылі украінскіх.

Выбухам Везувія разбурана 50 дамоў

РЫМ, 6. Агэнцтва Стэфані паведамляе:

«Паводле вестак з Нэапалю, у выніку выбуху Везувія разбураны 50 дамоў з 147 пакоямі, у якіх жылі 78 сем'яў. Патокі лавы пакрылі каля 50 гэктараў, з якіх 40 гэктараў--вінаградніку, а рэшта—лес. Вакольнае насельніцтва, якое спачатку пакінула вёскі, паступова зварачаецца ў сваё жыльлё.

Нямецкія рабочыя едуць на савецкія курорты

МАСКВА, 6. Наркамат аховы здароўя па прыкладу мінулых год арганізуе ў бягучым сэзоне лячэньне нямецкіх рабочых на курортах СССР. Заўтра прыбывае першая група рабочых з Нямеччыны (23 чал.). 13 чалавек будуць накіраваны на каўкаскія мінэральныя воды, рэшта — у Мацэсту.

Урад Пуанкарэ распраўляецца з лістаносцамі

ПАРЫЖ, 6. У адказ на дэманстрацыйную 24-гадзінную забастоўку парыскіх лістаносцаў урад пастанавіў звольніць і адлучыць ад работы на 3 месяцы без захаваньня пэнсіі «зачынщыкаў забастовак, арганізаваных унітарным прафсаюзам». Паводле вестак «Юманітэ» 12 лістаносцаў будуць звольнены і 30 адлучаны ад работы на 3 месяцы.

Іншыя унітарныя прафсаюзы дзяржаўных служачых заклікаюць сваіх членаў да салідарнасьці з лістаносцамі і прапануюць правесьці зборы на карысьць звольненых і адлучаных ад работы.

* * *

ПАРЫЖ, 6. Агэнцтва Гавас паведамляе:

«Палата дэпутатаў абгаварвае пытаньне аб забастоўцы лістаносцаў. Сацыялісты Фэврыс залвіў, што забастоўка была выклікана няправільнымі ўчынкамі ўраду. Камуністы Пікемаль бачыць у частковай забастоўцы паштовых служачых, яўную адзнаку агульнага нездавальненьня дзяржаўных служачых».

Да ведама членаў і кандыдатаў ЦК ЛКСМБ, членаў рэвізійных камісій і ўдзельнікаў пашыранага пленуму ЦК

У панядзелак, 10 чэрвеня, адкрываецца пасяджэньне пашыранага пленуму ЦК камсамолу з наступным парадкам дня:

1. Палітычны даклад ЦК партыі.
2. Даклад ЦК УсеЛКСМ.
3. Даклад бюро ЦК ЛКСМБ.
4. Даклад ЦСПСБ аб рабоце прафсаюзаў сярод рабочай моладзі і судакладу ОТО ЦК ЛКСМБ аб становішчы працы і асьвеце рабочай моладзі.

На пленум запрашаюцца прадстаўнікі ЦК камсамолу і ЦП прафсаюзаў, члены бюро Менскага АК і рэдактары юнацкіх газэт.

На матар'ялы па пасьведчаньні зьявіцца ў ЦК, 10-VI,—Савецкая, № 45

Сакратар ЦК ЛКСМБ Галавач.

За кулісамі рэпарацыйнае канфэрэнцыі

Перагаворы аб надзяленьні Нямеччыны калёніямі, у абмен за ўдзел у антысавецкім блёку

БЭРЛІН, 6. Левая газэта «Вэльт ам Абэнд» друкуе выкрыцьці свайго парыскага карэспандэнта аб перагаворах, што адбыліся за кулісамі рэпарацыйнае канфэрэнцыі. Гутарка ідзе пра вядомага ідэолёга анты-савецкага блёку Рэхбэрга і Кюльмана, які быў таварышам апошняга міністра замежных спраў пры Вільгэльме. Абодвы яны вялі ў Парыжы перагаворы з прадстаўнікамі розных дзяржаў аб стварэньні адзінага фронту супроць СССР у фінансавых, палітычных і ваенных адносінах. Разам з гэтым падрыхтоўвалася глеба аб надзяленьні Нямеччыны калёніямі, у абмен на яе ўдзел у антысавецкім блёку. У прыватнасьці, Кюльман высунуў ідэю перадачы Нямеччыне Гішпанскае часткі Марокo.

Парыскія перагаворы Рэйхбэрга і Кюльмана паслужылі тэмаю для запытаньня, якое камуністы Штэкер зрабіў ураду 4-га чэрвеня ў закрытым паседжаньні замежнае камісіі рэйхстагу.

Штэкер запытаўся, ці прымаў дырэктар рэйсбанку Шахт, як прадстаўляў па рэпарацыйнай канфэрэнцыі Нямеччыну, удзел у перагаворах Рэхбэрга, ці не.

Як паведамляе левая газэта «Бэрлін ам Моргэн», рэйсканцлер Мюлер адказаў на гэта пытаньне, што ўрад пра гэта нічога ня ведае, але ён ня можа паручыцца і за тое, што гэтага ня было.

Дагавор з Фордам

МАСКВА, 6. Сутнасьць дагавора з Фордам цесна зьвязана з намечанай праграмай разгортваньня Ніжагародзкага аўтамабільнага заводу. Завод павінен будзе даць у 1930-31 годзе—24.000, у 1932-33 г.—48.000 і ў 1933-34 годзе—100.000 машын. Выходзячы з гэтае праграмы, мы атрымаем ад Форда наступную колькасьць частак і дэталяй, якія ўваходзяць у склад машыны: першыя два гады ён дае далкам увесь камплект часьцей, якія ў нас будуць зьбірацца. У трэці год—50 проц., у чацьверты—25 проц. З першага году наступнае пяцігодкі машыны будуць зьбірацца з частак поўнасьцю зробленых у Саюзе.

Дагавор з Фордам зьяўляецца адным з самых буйных дагавораў, якія мы заключылі ў Амэрыцы і раўняецца па сваім абхвае і значэньні толькі дагавору з «Джэнэраль Электрык». Дагавор з Фордам сьведчыць аб тым, што ны толькі буйнейшая электратэхнічная фірма Амэрыкі, але і буйнейшая аўтамабільная фірма ідзе працаваць у Савецкі Саюз.

Аўтазавод у Н.-Ноўгарадзе па магутнасьці будзе займаць другое або трэцяе месца ў Эўропе (першы па магутнасьці будзе завод Форда, што будуецца ў Англіі. Канкураваць з намі можа толькі завод Сітраен). Тып машыны, які мы будзем выпускаць, прынят усімі краінамі сьвету і, бязумоўна, зьяўляецца першаклясовым сярод лёгкіх машын. Зусім ясна, што мы стаім напярэдадні буйнога пераломy ў галіне мясцовага транспарту.

ГЕНЭРАЛЬСКАЯ ВАЙНА У КІТАІ

ТАКТЫЧНЫ МАНЭЎР ФЫН ЮЙ-СЯНА

ШАНХАЙ, 6. Адначасова з Ханькоу і Пэйпіна паведамляюць, што паводле ўсеагульнае думкі, нядаўняя заява Фынь Юй-сяна аб жаданьні падаць у адстаўку і выехаць заграніцу, а таксама дэклярацыі яго падначаленых аб разрыве з ім і вернасьці Нанкіну, зьяўляюцца ўсяго-наўсяго тактычным манэўрам Фынь Юй-сяна. Пры дапамозе гэтага манэўра Фынь-Юй-сян выйграў час, узмацніў свае стратэгічныя лініі і закончыў рыхтаваньні да барацьбы. Ёсьць весткі аб сакрэтным саюзе паміж Фынам і Ен-Сі-шанам.

СЭСІЯ ВЫКАНКОМУ ІНТЭРНАЦЫЯНАЛУ ХАРЧАВІКОЎ

СТОКГОЛЬМ, 6. Сёньня ў Стакгольме адкрылася сэсія выканкому Інтэрнацыяналу харчавікоў. На сэсіі прысутнічаюць прадстаўнікі ЦК прафсаюзу рабочых харчовае прамысловасьці СССР Вэйнбэрг і Здобнікаў. Па прапанове савецкае дэлегацыі ў парадак сэсіі ўключаны пытаньні аб барацьбе з ваеннай небясьпекай і фашызмам. Даклады па гэтых пытаньнях даручаны савецкім дэлегатам. Адхілены прапановы савецкае дэлегацыі абгаварыць пытаньне аб прыняцьці ў Інтэрнацыянал харчавікоў унітарных саюзаў харчавікоў Францыі, Італіі, Грэцыі, Румыніі Паўднёвае Славіі.

ЧЫСТКА--ГРАМАДЗКІ АГЛЯД АПАРАТУ

„Што табе даручана і як ты даручанае выконваеш“—вось пытаньне з якім трэба падыходзіць да кожнага служачага.—Работу „былых“ людзей трэба праверыць з падвойнай уважлівасьцю.—Чыстка павінна быць праведзена толькі на падставе канкрэтных і праверaных фактаў.—Уся савецкая і партыйная грамадзкасьць павінна ўзяць пад кантроль справу падрыхтоўкі і прымацаваньня вылучэнцаў да падлягаючых чыстцы ўстаноў

ЯК БУДЗЕ ПРАВОДЗІЦЦА ЧЫСТКА ў РСФСР

Цэнтральная камісія пры НК РСІ РСФСР па кіраўніцтву чысткай савецкага апарату апублікавала кіруючыя паказаньні аб парадку і мэтадах чысткі. У паказаньні, між іншым зазначаецца:

«Прымаючы пад увагу, што вялікая колькасьць памылак пры частковых чыстках была ў выніку пасьпешнасьці, цэнтральная камісія папярэджвае супроць тэндэнцый, што наглядаюцца на мясцох, да ахвату чысткай большае колькасьці ўстаноў, як намечана ў плянне. У НК РСІ паступаюць запытаньні аб магчымасьці неадкладнае чысткі самых рознастайных устаноў (каапэрацыя, трэсты, культурна-асьветныя ўстановы і г. д.). Цэнтральная камісія папярэджвае, што такое пасьпешнае пашырэньне ліку аб'ектаў, ня можа прывесьці ні да чаго іншага, як да павялічэньня колькасьці памылак.

У гэтым годзе (да 1-га студзеня 1930 году) праверка нізавога (раённага і сельскага) апарату праводзіцца ня будзе, з прычыны вялікай загрузкі РСІ работай па праверцы вобласных (краявых), акруговых (губэрскіх) і павятовых устаноў, прадугледжаных у інструкцыі ведамствaў.

На падставе апублікаванай інструкцыі, усе мясцовыя органы РСІ павінны неадкладна вылучыць камісіі і прыступіць да работы па чысткі. У адаведнасьці з дырэктывамі 16-й усесаюзнай партканфэрэнцыі і на падставе апублікаванай інструкцыі, работа па чысткі павінна будавацца рашуча інакш, ня так, як гэта наглядалася ў 1928 і 1929 г. г. у радзе месц. Папершае, пры сапраўднай рабоце павінна быць яснасьць у пытаньні, каго трэба вычышчаць.

Як праяраемы працуе, асабліва за апошнія гады і перш за ўсё, зразумела, цяпер; як ажыцьцяўляе ў даручанай яму справе законы савецкае ўлады, пралетарскую клясавую лінію і дырэктывы камуністычнае партыі,—вось што трэба высьвятліць у адносінах на кожнага служачага. Высьвятліць гэта можна толькі тады, калі будзе праведзена абсьледваньне выкананьня работы кожным. «Што табе даручана і як ты выконваеш даручанае»—вось пытаньне, з якім трэба падыходзіць да кожнага служачага.

Калі мы чысьцім перш за ўсё галоўным чынам на падставе ацэнкі якасьці работы, родя ўсялякіх паперак адыходзіць на другі плян. Дзяцей «былых» людзей здымаць з работы толькі за іх паходжаньне інструкцыя цалкам забараняе, да саміх-жа «былых» **трэба падыходзіць больш строга і з большымі патрабаваньнямі,** як да іншых, але таксама на падставе ацэнкі іх работы пры савецкай уладзе. Калі перад камісіяй па чыстцы праходзіць «былы», дык зусім відавочна, **што яго работу трэба праверыць у два, у тры разы больш дакладна,** але вычышчаць яго трэба не таму, што ён некалі быў папом, афіцэрам, ці дваранінам і г. д., а толькі на падставе фактаў (хоць-бы і невялікіх) скажэньня клясавае лініі, раагільдзяйства, бюракратызму і г. д. За 11 з палов. год савецкае ўлады, ацэніць людзей па іх сапраўдных якасьцях мы маем усе магчымасьці. З новае ўстаноўкі чысткі вынікае таксама неабходнасьць адначасовага зьнішчэньня пры ёй **недахопаў у рабоце праяраемых устаноў.**

«Выяўленыя недахопы ў рабоце ўстановы—прапануе інструкцыя — выносяцца на шырокае абгаварэньне эканомкамісій, вытворчых нарад і агульных сходаў рабочых і служачых». Падругое, зусім зразумела, што цяпер ня можа быць месца габінэтным мэтадам і сакрэтам. Ня толькі сумленныя служачыя павінны быць прыцягнуты да работы камісіі па чысткі, ня толькі пытаньні чысткі павінны быць вынесены на агульны сход, але абавязкова кожны факт, які ставіцца ў віну таму ці іншаму служачаму, павінен быць папярэдня паведамлен яму, каб даць магчымасьць прадставіць усе рэабілітацыйныя матар'ялы. Кожная заява, паведамленьне, заметка насьцен-газэты—павінны быць праверaны і пацьверджаны фактамі. **Чыстка павінна быць пабудована толькі на канкрэтных фактах.**

Хаця пра гэта і не зазначаецца ў інструкцыі па чысткі, але трэба падкрэсьліць, што работа пагражае абясьцэніцца, калі ня будзе забясьпечана масавае вылучэньне рабочых і сялян у апарат. У інструкцыі пра гэта не зазначана таму, што гэта не ўваходзіць у абавязкі камісіі па чысткі. Гэта справа перш за ўсё прафсаюзаў, якія ствараюць для гэтага спэцыяльныя камісіі. **Але калі ўся наша партыйная і савецкая грамадзкасьць ня возьме пад кантроль справу падрыхтоўкі, заўчаснага прымацаваньня вылучэнцаў да падлягаючых чыстцы устаноў і іх па магчымасьці папярэдняга (як патрабуе 16-я Ўсесаюзная канфэрэнцыя) азнаямленьня,—дык гэта работа будзе сарвана, як яна была сарвана пры частковых чыстках.**

Шляхам перамяшчэньняў як у бок прасоўваньня тых, што растуць, і зьніманьня тых, што не спраўляюцца з работаю, можна, на другі дзень пасьля чысткі аслабаніць для вылучэнцаў імёны на тыя пасады, якія па характару работы ім адпавядаюць. Таму трэба прыняць усе захады да неадкладнага прымацаваньня рэзэрву вылучэнцаў да падлягаючых чыстцы ўстаноў і арганізацыі іх падрыхтоўкі.

Рэзкая розьніца паміж тымі чысткамі, што былі дагэтуль і цяперашняй заключаецца ў тым, што цяперашняя чыстка мае на мэце ня толькі аслабаніцца ад шкодных элемэнтаў, але і **прымусіць адчуць кожнага служачага, што ўсякі, хто нясумленна адносіцца да работы, не пакараным застацца ня можа. У той-жа час усе сумленныя служачыя ні ў якай меры не павінны глядзець на чыстку, як на акт агульнага недавер'я да іх.** Наадварот, толькі пры іх дапамозе пры іх бліжэйшым актыўным удзеле удасца вызваліцца ад сапраўдных бюракратаў і асоб, якія скажаюць клясавую лінію. Партыя і ўрад праводзяць чыстку з поўнай пераконанасьцю ў тым, што асноўная маса служачых з энтузіязмам прыме ўдзел у правядзеньні чысткі савецкага апарату ў адпаведнасьці з узросшымі патрабаваньнямі да яго нашага сацыялістычнага будаўніцтва.

Цэнтральная камісія РСФСР па кіраўніцтву чысткай савецкага апарату заклікае ўсіх рабочых, сялян і служачых дапамагчы ў правядзеньні гэтае работы непасрэдным удзелам і нясупынным кантролем. Толькі пры дапамозе шырокіх працоўных мас органам РСІ удасца правесьці гэту вялізную работу і ўхіліцца паўтарэньня памылак, якія абясьцэньваюць значэньне раней праведзеных частковых чыстак.

Цяжкі эканамічны стан Бэсарабіі

ВЕНА, 1. Цяжкі эканамічны крызіс у Бэсарабіі адлюстроўваецца таксама на гандлі віном і фруктамі, якія зьяўляюцца галоўнай крыніцай багацьця гэтае правінцыі. Да вайны разьмер гандлю віном і фруктамі ў Бэсарабіі дасягаў 800 мільёнаў лей. З прычыны прымусовага адлучэньня Бэсарабіі ад СССР, гэта галіна вытворчасьці пазбавілася натуральнага рынку збыту. Апошняе выступленьне бэсарабскага кулацтва за аднаўленьне зносін з СССР і тлумачыцца безнадзейным эканамічным становішчам Бэсарабіі.

ФАШЫСЦКІ ДРУК СУПАКОЎСЯ

РЫМ, 6. Італьянскі фашысцкі друк, які пасьля першых паведамленьняў аб перамозе рабочае партыі на ангельскіх выбарах праяўляў некаторыя аднакі трывогі, цяпер супакоіўся і ўпэўнен, што «рабочая партыя рэвалюцыі ня зробіць, а зьмены ў замежнай палітыцы Англіі павінна баяцца больш Францыя, чым Італія».

Пра пытаньне аб англа-савецкія адносіны, газэта піша: «Аднаўленьне англа-савецкіх адносін нікому не нашкодзіць». СССР прадстаўляе сабою вельмі важную рэальную сілу, каб яго можна было проста пакідаць бяз увагі».

3.250 чалавек загінула пры землятрасеньні ў Пэрсіі

ТЭГЕРАН, 6. Афіцыяльна паведамляецца, што ў час землятрасеньня ў Харасане (Пэрсія) забіты 3.250 чалавек і паранена 1.150. Зруйнована 90 вёсак.

Нямецкі ўрад пачынае паход супроць беспрацоўных

Цяжар рэпарацый нямецкая буржуазія ўскладае на плечы рабочых

БЭРЛІН, 6. Нямецкі міністр народнае гаспадаркі Курдыус (член нямецкае народнае партыі) абвясьціў учора у рэйхстагу, што па скапчэньні рэпарацыйнай канфэрэнцыі, нямецкі ўрад унясе ў рэйхстаг праект пашыранае праграмы рэформ з мэтаю палягчэньня становішча нямецкае гаспадаркі.

Дзякуючы сацыяльнаму страхаваньню беспрацоўных,—заявіў міністр,—папсаваны на ўсіх галінах устоі працоўнае маралі. Таму трэба страхаваньне ад беспрацоўя грунтоўна перагледзіць, для чаго трэба пачаць не з павышэньня страхавых узносаў, а з скарачэньня ліку застрахаваных».

Гэта заява міністра—члена народнае партыі—выклікала ў радох сацыял-дэмакратаў вялікую зьбянтэжанасьць. Справа ў тым, што на Магдэбурскім зьезьдзе сацыял-дэмакратычнае партыі, які толькі што закончыўся, правадыры сацыял-дэмакратыі гаварылі прытворна-радыкальныя прамовы пра тое, што яны не дапушчаюць і думкі аб якім-бы там ні было пагоршаньні сацыяльнага страхаваньня беспрацоўных.

ПА САВЕЦКІМ САЮЗЕ

На палёх СССР

Спрыяючыя віды на ўраджай

ПАЛТАВА, 6. Стан яравога збожжа ў акрузе добры. У апошнія дні праійшлі дажджы, пасьля якіх наступіла яснае і цёплае падвор'е.

АРЦЁМАЎСК, 6. Збожжа расьце ў спрыяючых кліматычных умовах. Пэрыядычна выпадаюць дажджы.

КІЁЎ. 6. Бэсьпа ярыны заканчваецца. Пшаніца ацэньваецца ў 3,22 балы, жыта —3,3.

КАМЕНЕЦ, 6. Стан азімае пшаніцы ацэньваецца ў 3,3 балы. Усходы раньніх яравых здавальняючыя.

Аўтапрабег Масква-Ніжні-Масква

МАСКВА, 6. У сувязі з пабудоваю аўтамабільнага заводу ў Ніжнім Ноўгарадзе, Маскоўскі аўтаклюб наладжвае пробны прабег машын Форда па маршруту Масква—Ніжні-Ноўгарад—Масква, працягам у 850 кілёмэтраў. Адначасова прабег праводзіцца пад лёзунгам агітацыі за стварэньне аўтамагістралі. У прабегу будуць удзельнічаць 30 аўтамашын і 30 матацыклаў. Найбольш поўна будуць прадстаўлены найпоўныя мадэлі машын Форда, Намі, Сітроэна і Татра. З грузавых машын, апрача мадэляй Форда, удзельнічаюць Шэўроле, АМО, Грэў і інш. У час прабегу будзе параўноўвацца дынаміка, эканамічнасьць і трываласьць. Прычым, ацэнка будзе зроблена на злучнасьці ўсіх якасьцяй. Апрача машын Форда, у прабегу зварачае на сябе ўвагу новы савецкі аўтамабіль Яраслаўскага заводу «Я ПЯЦЬ» з маторам «Гэркулес». Старт прабегу азначан на 22-га чэрвеня.

Прысуд па справе фінскіх шпіёнаў

ЛЕНІНГРАД, 6. Сёньня, у вайсковым трыбунале Ленінградзкае вайсковае акругі закончылася справа фінскай шайкі шпіёнаў - кантрабандыстых. У апошнім слове падсудныя прасілі літасьці. Вайсковы трыбунал прыгаварыў 4-х да 8 год зьняволеньня з суровым адмежаваньнем, канфіскацыяй маемасьці і паражэньнем у правох на 5 год.

Агульнасаюзны фонд па барацьбе з сухменьню

МАСКВА, 5. Прэзыдыум ЦВК СССР зацьвердзіў распрацаваны саюзным Саўнаркомам праект новага палажэньня аб агульнасаюзным фондзе барацьбы з сухменьню. Ён прызначан для доўгатэрміновага крэдытаваньня мерапрыемстваў па барацьбе з сухменьню. Пазычкі з фонду будуць выдавацца выключна для рэарганізацыі калектыўных гаспадарак. У выключных выпадках пазычкі могуць выдавацца і індывідуальным бядняцкім і серадняцкім гаспадаркам. Пазычкі выдаюцца на тэрміны ад 5 да 10 год.

Вясковы камсамол—на барацьбу з самагонам

МАСКВА, 3. Закрыўся ўсесаюзны пленум антыалькагольных таварыстваў. У новы ўсесаюзны саюз антыалькагольных таварыстваў увайшло

ПАРТЫЙНАЕ БУДАЎНІЦТВА

Генэральная праверка і чыстка партыйных радоў

загартуе партыю для далейшага пасьпяховага сацыялістычнага наступленьня

Кіраўнічыя кадры КП(б)Б на праверцы

На 3-м куставым сходзе ячэек КП(б)Б у клюбе К. Маркса

Тав. **Герасімаў** ва ўступнай прамове спыняецца на значэньні і задачах чысткі.

Першым правяраецца тав. **Валынец.** Тав. Валынец коратка апавядае пра асобныя моманты свайго жыцьця. Ён—сын бедняка-селяніна. Маладым хлопцам пашоў працаваць на завод. Працаваў рамонтным рабочым на чыгунцы. У 1912 годзе ўступіў у партыю. Актыўны ўдзельнік грамадзянскай вайны, член ЦКК КП(б)Б.

Прысутныя адчуваюць, што тав. Валынец сумленны, адданы партыі таварыш, стары вытрыманы бальшавік.

*

Праверку праходзіць **тав. Дамброўскі.** Сход з напружанай увагай слухае яго жыцьцяпіс. Проста, без лішніх слоў, гаворыць тав. Дамброўскі аб сваёй рабоце. Юнацкія гады праходзяць у рабочай сям'і, у рабоце на мэталюргічным заводзе. Бацька—рабочы мэталісты. Я таксама,—кажа тав. Дамброўскі,—з малых год пашоў працаваць на завод. Некалькі год працаваў на мэталюргічным заводзе токарам. Тав. Дамброўскі працаваў ля варштату 11 год. У 1909 годзе тав. Дамброўскі ўступіў у партыю. Пасьля пачынаецца бурны пэрыяд рэвалюцыйнай работы. Эміграцыя. Тав. Дамброўскі прымушаны эміграваць з Расіі ў Амэрыку, каб ня быць арыштаваным. Там ён услупае ў рады рэвалюцыйнай арганізацыі, працуе токарам на мэталюргічных заводах. 1917 год. Тав. Дамброўскі ўступае ў Чырвоную гвардыю, актыўна ўдзельнічае ў арганізацыі чырвонагвардзейскіх атрадаў. Са зброяй у руках ён знаходзіцца ў перадавых радах змагароў за рэвалюцыю. Кастрычнік поўнасьцю захапіў тав. Дамброўскага. Загартаваны ў барацьбе, пралетар-бальшавік, самааддана змагаецца за перамогу рэвалюцыі. Тав. Дамброўскі—удзельнік першых рэвалюцыйных патрулёў. Міхайлаўскі манеж, юнкеры ўмацаваліся і заселі за моцнымі магутнымі сьценамі манежу. Іх трэба выбіць адтуль, перамагчы, разбіць—гэта загад ваенна-рэвалюцыйнага камітэту. На штурм Міхайлаўскага манежа кінуты лепшыя сілы рэвалюцыйных войск. Тав. Дамброўскі быў у першых радох сярод іх. У віры баёў, у віры вялікай эпапэі грамадзянскай вайны праходзіла далейшае жыцьцё тав. Дамброўскага. Ён на франтох, на перадавых пазыцыях. Ижэўск і Царыцын, Арэнбург і Баку. Работа ў ЧК, у рэўтрыбунале.

Пасьля, калі змоўкілі гарматы, задымілі заводы, запрацавалі фабрыкі, тав. Дамброўскі пераходзіць на партыйную работу. Зараз ён член ЦКК КП(б)Б і старшыня Менскай АКК КП(б)Б.

Тав. Герасімаў пытаецца тав. Дамброўскага аб яго сувязі з масамі, аб тым, як уцягваюцца ў работу РСІ рабочыя масы.

— Уся работа РСІ, — адказвае тав. Дамброўскі, — праходзіць пры самым актыўным удзеле рабочых менскіх прадпрыемстваў. У нас, як за правіла, прынята, што кожны член АКК павінен няменш аднаго разу ў тыдзень бываць па заводах і фабрыках. Я і сам вельмі жадаю пайсьці калі-небудзь на «Энэргію», успомніць старое і напрацаваць за такарным варштатам. Але зусім няма часу.

*

Тав. **Кофцераў.** Сход слухае яго жыцьцяпіс. Тав. Кофцераў апавядае пра сябе. Нарадзіўся ў бядняцкай сям'і ў Віцебшчыне. Да 17 год працаваў батраком у абшарніка. Некалькі год быў заграніцай. У 1906 годзе ўступіў у РСДРП, адразу быў арыштаваны. У турме прасядзеў да 1911 году, потым жыцьцё праходзіла так, як павінна праходзіць жыцьцё кожнага падпольнага работніка, кожнага камуністага.

У 1917 годзе тав. Кофцераў прыняў пчыры ўдзел у рэвалюцыі і потым у грамадзянскай вайне. Зараз тав. Кофцераў—член ЦКК КП(б)Б. Тав. Кофцерава распытваюць аб яго цяперашняй рабоце, аб яго сувязі з вёскай. На ўсе запытаньні тав. Кофцераў дае адказы. Адзін таварыш, добра ведаючы тав. Кофцерава, апавядае сходу аб тым, як адносіцца да тав. Кофцерава вёска, дзе ён нарадзіўся. Сяляне гэтай вёскі—кажа гэты таварыш—любяць тав. Кофцерава, ганарацца ім, цікавяцца яго работай. Вось факты. Група сялян з віцебскай дэлегацыі, прыехаўшых на ўсебеларускі зьезд Саветаў, наведала т. Кофцерава і шчыра дзякавала яго за тое, што ён не парывае сувязі з вёскай, дамагае ёй сваімі парадамі. Апошнія словы пакрываюцца гучнымі воплескамі Асноўнае выканана. Тав. Кофцераў памятае аб масах, тав. Кофцераў цесна зьвязаны з імі.

*

Тав. **Кац.** Ён гаворыць пра сябе ціха, спакойна, проста, як і ўсе таварышы, што праходзілі праверку. Ён адчувае ўсю тую таварыскую абстаноўку, пры якой праходзіць праверка.

Я рабочы,—кажа та. Кац,—працаваў па вытворчасьці 12 год, ніякай асьветы ня маю. Быў зусім няпісьменным. З 1905 году па 1918 год быў у Бундзе, потым вышаў з Бунду, стаў рыхтавацца да таго, каб уступіць у камуністычную партыю. Я зразумеў, што толькі камуністычная партыя зьяўляецца партыяй рабочых, партыяй пралетарыяту. У 1920 годзе я ўступіў у камуністычную партыю. Партыя мяне напісьменнага, простага, цёмнага рабочага высунула на адказную кааперацыйную работу.

Камісія ЦКК УсеКП(б) за працай

1) т. ШКІРЫЧ—член камісіі, рабочы заводу «Бальшавік», 2) т. ГЕРАСІМАЎ — старшыня камісіі і 3) т. КАЛНІН—член камісіі.

Першыя гады было цяжка, бо я нічога ня ведаў, ня ўмеў нават больш-менш добра напісаць сваё прозьвішча. Але мне дапамаглі. Мяне акружылі добрай таварыскай абстаноўкай. Цяпер я цалкам асвоіўся з работай. Аднак, ніяк не магу забыць тых першых двух год, калі я толькі пачынаў працаваць вылучэнцам. Партыя зрабіла мяне новым чалавекам. Яна зрабіла мяне з няпісьменнага рабочага актыўнага працаўніка. Зараз я член бюро АК КП(б)Б і старшыня праўленьня МЦРК.

Першым выступіў **тав. Герасімаў.** Стары, выпрабаваны бальшавік, крыху ўсхвалявана. Ён, які прайшоў школу падпольнай рэвалюцыйнай работы, шчыра задаволены.

Таварышы! Калі-б мы расказвалі аб гэтым факце нашым замежным таварышом, расказвалі-б пра гэта за мяжою, дык нам-бы ніхто не паверыў, з нас-бы сьмяяліся. Як гэта? Няпісьменны, нічога ня ведаючы рабочы стаў працаўніком, які выконвае адказную, складаную работу. Ці-ж гэта ня наша дасягненьне. Словы тав. Герасімава пакрываюцца авацыяй. Рабочыя адзін за адным выступаюць на трыбуну і гавораць аб тым, што тав. Кац актыўны работнік, добры таварыш. Ён наш, цесна зьвязаны з намі, з простымі рабочымі, сказаў у сваім выступленьні адзін стары рабочы. Мы павінны ганарыцца тым, што тав. Кац добра спраўляецца са сваёй работай. Яго посьпех—наш посьпех. Тав. Кац можа сьмела насіць годнасьць камуністага і мець білет члена Камуністычнай партыі (бальшавікоў) Беларусі.

Правяраецца **тав. Кушняроў.** Сход цікавіцца мінулым т. Кушнярова. Апошні коратка апавядаў аб сваім жыцьці. Сын батрака, сам быў батракам да 16-ці год, працаваў у абшарніка. У 1919 годзе тав. Кушняроў уступае ў рады КП(б)Б і зараз член ЦКК КП(б)Б, рабочы-вылучэнец.

*

Праверку праходзяць **т. т. Камэнштэйн, Папякоўскі, Лазоўскі, Стасевіч.** Усе таварышы расказваюць аб праробленай рабоце, аб сваім жыцьці, аб удзеле ў грамадзянскай вайне і г. д. Прысутныя задаюць ім цэлы рад розных пытаньняў, цікавяцца асобнымі эпізодамі іх барацьбы і работы, цікавяцца іх сувязью з масамі.

*

Т. т. Крэмэр, Вінаградаў, Хлеўнікаў, адсутнічаюць. Тав. Герасімаў просіць сход, каб жадаючыя што-небудзь сказаць пра гэтых таварышоў выступілі і выказалі свае думкі. Некаторыя таварышы выступаюць.

Каму ня месца ў партыі

Жалезнай мятлой чысткі па кулацкіх, чужых партыі элемэнтах

Засьмечаньне партыі чужымі элемэнтамі служыць для нас цяжкім грузам, які пасьлаблае наш рух на шляху сацыялістычнага перабудаваньня нашай вёскі.

Якім-бы малым ня быў процант такіх сацыяльна-чужых элемэнтаў, сам факт знаходжаньня іх у партыі газорыць ужо аб буйным недахваце ў справе рэгуляваньня росту ў нашых вясковых арганізацыях. Ставіць сабе непасрэдная задачай—ісьці фарсаваным тэмпам на шляху калектывізацыі і мець у наасобных вясковых арганізацыях хаця і 1,5 проц. прадстаўнікоў дробнакапіталістычных гаспадарак—гэта ёсьць вялікая анамалія.

Параўнальна з іншымі раёнамі (напрыклад, Самарскі ці Паўночная Сібір), дзе гэты процант вырастае да 7 з ліку вясковых камуністых, у нас у Беларусі гэтыя «заблудившиеся» кулакі, паводле вестак, вырасьлі пераважна з сераднякоў за час прабываньня ў партыі, за кошт дапаможнай савецкай службы і праз незаконна атрыманыя ільготы. Аднак, ёсьць і такія «тыпы», якія былі прыняты ў партыю ў якасьці кулакоў, што зьяўляецца простым злачынствам супроць партыі тых арганізацый, якія такіх «калектывістых» прымаюць у партыю.

Вось, напрыклад, член партыі з 1928 г. Фэдасенка, які мае 16 дзес. ворнай зямлі, 6 дзес. сенажаці, 2 коняй, 5 галоў рагатае жывёлы, некалькі царагіх с.-г. машын на 1.500 руб. Акрамя таго ён мае млын, які дае яму прыбытку 700 руб., а падатку ён плаціць чамусьці толькі 13 руб. і 57 кап. Другі, з дазволу сказаць, «член партыі» з 1928 г., мае 24 дзес. зямлі, прыбытковасьць гаспадаркі вызначана ў 1.117 руб., а падатку плаціць 113 руб. А нейкі Дрозд Гарасім, дык той зусім «бядняк», бо плаціць падатку ўсяго 414 руб., наймае батрака. Цяжка сабе ўявіць, як гэты «камунар» праводзіць клясавую лінію і абараняе ідэю калектывізацыі. Яшчэ больш дзіўны робіцца, як гэта пад адным палітычным дахам ужываецца такі «кулак, які ўрастае ў сацыялізм», батракі і нашы паўпралетары вёскі. Трэба меркаваць, што ў такіх арганізацыях, дзе хаваюцца падобныя «зубры», прыцёк у партыю пралетарскіх элемэнтаў—справа безнадзейная.

Па частцы кулацкага засьмечаньня па БССР ідуць у нас наперадзе дзьве акругі—Віцебская, дзе кулакоў сярод вясковых камуністых налічваецца 4,6 проц., і ў Полацкай акрузе—2,7 проц. Гэта азначае, што рэгуляваньне росту ў гэтых акругах у гэтай галіне мела сур'ёзныя адхіленьні ад дырэктыў партыі. Прымаліся ў партыю асобныя кулачкі з хутаран, якіх наогул у гэтых акругах досыць вялікі процант. Гэтыя адхіленьні знаходзяць сабе тлумачэньне і ў тым, што раней у гэтых акругах у большай меры праяўляліся «спачувальныя» адносіны да пашырэньня хутарскай палітыкі землякарыстаньня. Найлепшы стан вясковых арганізацый па БССР паказвае Гомельская акруга, дзе батрацкія і бядняцкія элемэнты складаюць звыш 50 проц.

Няма чаго, зразумела, даводзіць, што чыстка партыі павінна будзе радыкальна аздаровіць партарганізацыі, вызваліўшы іх ад кулацкага сьмецьця, якое выпадкова трапіла ў партыю і ва ўсе нашы арганізацыі, а ў Віцебскай і Полацкай, акругах асабліва, якія павінны «дагнаць і перагнаць» Гомельскую акругу, шырока разгарнуўшы ўцягненьне ў партыю батракоў і беднякоў, нашых вясковых пралетараў.

Чыстка павінна будзе рашуча падцягнуць тыя нашы партарганізацыі і парторганы, якія нядбайна і фармальна адносіліся да справы рэгуляваньня росту партыі ў вёсцах. Гэта задача зьяўляецца справаю першачарговай важнасьці. Пры чыстцы нам трэба на справе ўстанавіць строгую адказнасьць рэкамэндаваўшых нам у партыю тое «сацыяльнае сьмецьце». ад якога мы цяпер вызваляемся. У роўнай меры гэта трэба зрабіць і ў адносінах да тых «кіраўнікоў» раённых арганізацый, як, напрыклад, Хоцімская (Магіл. акр.), дзе гэта засьмечаньне яўна-кулацкім і чужым элемэнтам нагледалася ў найбольшай ступені. Трэба жорсткімі мерамі, па якія толькі здольна чыстка, паказваць усім, як партыя змагаецца з парушэньнямі сваіх дырэктыў наогул, і ў галіне рэгуляваньня росту партыі асабліва.

А. ВІНАГРАДАЎ.

Партыйная маса выбірае свае кіруючыя органы

Перавыбары бюро—лепшы паказальнік узросту палітычнай актыўнасьці партыйных мас. Шырока разгорнутая самакрытыка і ўнутрыпартыйная дэмакратыя на перавыбарчых сходах—гарантыя далейшых посьпехаў у рабоце ячэек

Перавыбары на заводзе „Чырвоная Зара"

(МЕНСК)

Наша ячэйка налічвае ў сваім складзе ўсяго 41 члена, 13 кандыдатаў партыі, а вырасла ячэйка за справаздачны пэрыяд на 6 чалавек.

Са справаздачнага дакладу сакратара ячэйкі **т. Пятрухіна** было відаць, што бюро ячэйкі і ячэйка цалкам ва ўсіх галінах правяла вялікую работу. Пытаньні вытворчага характару ня сходзілі з парадку дня. І таму тут мы маем вялікія посьпехі. Напрыклад, дырэктыва партыі па зьніжэньні адміністрацыйна-гаспадарчых выдаткаў на 20 проц. за першае паўгодзьдзе выканана поўнасьцю, па зьніжэньні сабекошту выканалі з перавышэньнем на 7 проц.

Прадукцыйнасьць працы ў параўнаньні з мінулым годам павысілася на 20 проц., і калі ў мінулым годзе наглядаліся выпадкі спазьненьня на работу, дык у гэтым годзе іх няма. Расьце вытворчасьць, зьніжаецца сабекошт, а разам з гэтым павысілася ў гэтым годзе зарплата на 4½ проц.

Рабочыя пачалі лепш цікавіцца вытворчасьцю, іх ініцыятыва павышаецца. Наш завод выклікаў на спаборніцтвы дражджавыя заводы Менску, Віцебску, «Моссельпрома» і кіеўскі завод....

Кампанія па перавыбарах гарсавету прайшла вельмі добра, было ўцягнута амаль 100 проц. рабочых. Шмат зроблена па перавыбарах падшэфнага сельсавету. Бюро ячэйкі накіравала ў вёску аднаго партыйца на ўвесь час перавыбараў, а ў дапамогу гэтаму партыйцу бюро ячэйкі вылучыла брыгаду, якая сыстэматычна выяжджала на вёску. Дзякуючы правільнаму кіраўніцтву бюро ячэйкі, брыгада са сваімі задачамі справілася, выбраны працаздольны сельсавет. Побач з усімі посьпехамі ёсьць рад адмоўных зьявішч. Сакратару ячэйкі было дана пытаньне: «Ці ёсьць у нас таварышы з правым ухілам». Сакратар сказаў, што няма. Між тым, сход паказаў на асобных партыйцаў, якія кажуць: «Пяцігодка—гэта фантазія, выканаць яе немагчыма». Чаму сакратар гэтага ня ведае? Ды таму, што ён ня зьвязаны з рабочымі, не вывучае і ня ўлічвае настрояў мас. Нельга абыйсьці моўчкі такі момант. Пры перавыбарох бюро хтосьці прапанаваў кандыдатуру Перэльман, якая набіла «рэкорд» па прагулах, спазьненьнях і нядбайных адносінах да вытворчасьці. Ідучы са сходу, таварышы гаварылі: «Бюро выбрані працаздольнае за выключэньнем Перэльман». Ці не забыліся тут аб тым, што ў бюро трэба выбіраць таварышоў прыкладных, перадавых на прадпрыемстве.

З беларусізацыяй у нас зусім кепска. Пастаноў было шмат, а вынікаў няма. Пратаколы пішуцца парасійску, а потым пераводзяцца на беларускую мову. «Зьвязда» выпісваецца вельмі мала, заўком праводзіць работу на расійскай мове.

Вылучэньне рабочых-партыйцаў на адказныя пасады праводзілася габінэтным парадкам. Калі вылучэнец прыступае да выканаьня сваіх абавязкаў, тады толькі ставяць пытаньне на сходзе ячэйкі аб яго вылучэньні. Пасьля выбароў бюро абнавілася на 7 чалавек.

А. МАНЬКОЎ.

Пад знакам шырокай самаправеркі

(Ячэйка КП(б)Б друкарні «Зьвязда»)

Да перавыбараў райком абсьледаваў ячэйку, што дало надзвычайна багаты матар'ял аб стане і рабоце ячэйкі, аб прадпрыемстве, што абслугоўваецца ячэйкай. На перавыбарчым сходзе, пасьля справаздачнага дакладу сакратара тав. **Стругача** аб рабоце бюро, былі зачытаны вывады камісіі, якая абсьледавала работу ячэйкі. Гэта яшчэ больш поўна выявіла стан і работу ячэйкі і павялічыла актыўнасьць сходу.

Спрэчкі больш за ўсё групаваліся вакол пытаньня масавай работы ячэйкі, бо з ёю зьвязан рад тых недарэчнасьцяй, якія мелі месца на прадпрыемстве. У друкарні ёсьць група рабочых, якая справу свайго дабрабыту ставіць вышэй інтарэсаў прадпрыемства, а ячэйка масавай работай ня ў поўнай меры параўнівала тэндэнцыі гэтых некалькіх чалавек.

Ячэйка ня ў поўнай меры выканала дырэктывы райкому партыі, якія былі даны пры абсьледваньні ў мінулым годзе—гэта адзін з буйнейшых недахопаў у рабоце ячэйкі.

Вязумоўна, што ў практычнай рабоце былі посьпехі: гаспадарчае кіраўніцтва прадпрыемствам, рацыяналізацыя, паляпшэньне прафработы, удала прайшоў агляд вытворчых нарад і шмат інш.

Без усялякага напярэднага намячэньня кандыдатур, пры шырокай унутрыпартыйнай дэмакратыі прайшлі перавыбары бюро.

У склад бюро выбраны членамі т. т. Стругач, Кобец, Новікаў, Пратусэвіч і інш. На першым пасяджэньні бюро сакратаром ячэйкі выбраны тав. Стругач.

С. Р—а.

ПЕРАМЯНІЛІСЯ Ў ЛЕПШЫ БОК

(Ячэйка КП(б)Б Белдаржгандлю, Менск)

У ячэйцы было ня ўсё добра. Разьбіраў яе справы райком, пабывалі ў ячэйцы і прадстаўнікі акругкому. Але гэта было раней... Тады ячэйка не рэагавала на хваравітыя зьявішчы, якія праяўляліся ў апараце.

За апошні-ж пэрыяд мы наглядаем зусім іншае. Ячэйка заслухоўвала пэрыядычна даклады камуністых, кіраўнікоў устаноў і прадпрыемстваў, давала канкрэтныя ўказаньні ў іх рабоце. Бюро аддала вялікую ўвагу справе забесьпячэньня кваліфікаванай рабочай сілай пакінава пабудаваных прадпрыемстваў: было паслана 5 рабочых-камуністых на перакваліфікацыю. Ячэйка наладзіла добра работу шэфскага таварыства, якое правяло сярод падшэфнага сялянства рад карысных мерапрыемстваў.

Вялікая работа праведзена па партыйным выхаваньні членаў ячэйкі: прапрацаваны пастановы кангрэсу Камінтэрну, XII-га зьезду КП(б)Б, пленуму ЦК і заслухан даклад аб выніках XVI партканфэрэнцыі. Ва ўсёй партвучобе было вялікае месца адведзена растлумачэньню сярод партыйцаў сутнасьці і карэньняў правага ўхілу і прымірэнцтва.

Па ініцыятыве ячэйкі былі арганізаваны гурткі: палітычны, беларусазнаўства і інш.

Трэба ў будучым шырэй разгарнуць работу сярод работніц аручнай базы, бо яны вельмі адсталыя, сярод іх ёсьць шмат няпісьменных.

Перавыбары прайшлі актыўна пад знакам усебаковай праверкі ўсіх галін работы ячэйкі, пры шырока разгорнутай самакрытыцы.

Г. МАЗО.

На пленуме Менскага АК КП(б)Б

Аб Рэзьце і рэгуляваньні сацыяльнага складу Менскай партыйнай арганізацыі

З дакладу т. Тамашэўскага

12-ты зьезд КП(б)Б паставіў перад нашай арганізацыяй задачу ўзмацненьня вярбоўкі ў партыю перадавых кадраў рабочае клясы і батрацтва. Да канца 1930 году ў складзе КП(б)Б павінна быць ня менш 60 проц. рабочых ад варштату, с.-г. рабочых і батракоў, 12-ты зьезд КП(б)Б абавязаў менскую партыйную арганізацыю, каб сярод нанавы прыманых было 90 проц. рабочых і работніц ад варштату, с.-г. рабочых і батракоў.

Як мы выконваем гэтую дырэктыву? На 1-га студзеня 1929 году менская арганізацыя налічвае ў сваіх радох 8.985 членаў і кандыдатаў партыі. З гэтага ліку рабочыя ад варштату складаюць 32,7 проц., а с.-г. рабочыя і батракі—толькі 2,6 проц. У параўнаньні з мінулым годам мы маем некатораe паляпшэньне сацыяльнага складу арганізацыі. Рабочае ядро ў арганізацыі павялічылася на 6,2 проц., процант непралетарскай часткі ў складзе арганізацыі зьменшыўся. Так, процант служачых зьменшыўся на 0,3. Дынаміка росту за лік рабочых, батракоў і с.-г. рабочых застаецца зусім нездавальняючай. З 1-га студзеня 1928 году па 1-га студзеня 1929 году процант рабочых ад варштату павялічыўся з 31,9 да 32,7 проц., с.-г. рабочых і батракоў—з 1,7 да 2,6 проц.

Мова гэтых лічбаў гаворыць аб тым, што вярбоўка ў рады партыі праходзіць зусім невыстарчальна. Асабліва значныя недахопы ў гэтым напрамку мы маем у адносінах вярбоўкі ў партыю батракоў, с.-г. рабочых і работніц.

Работніцы складаюць зусім невялікую частку нашай арганізацыі. Мы павінны рашуча абвергнуць разважаньні аб тым, што нібы ў нас няма ніякіх крыніц для росту арганізацыі. Гэтыя крыніцы ёсьць і прытым яны даволі вялікія. Мы ўцягнулі ў партыю толькі 16 проц. усіх рабочых акругі, у адносінах-жа батракоў і с.-г. рабочых гэта лічба яшчэ меншая. Яна складае ўсяго 1,1 проц.

Зараз перад усёй арганізацыяй стаіць неадкладная задача палепшыць масавую работу на прадпрыемствах, ажывіць яе, зьвярнуўшы асаблівую ўвагу на разгортваньне культурна-выхаваўчай работы ў цэху, зьмене, аддзяленьні. Культурна-выхаваўчая работа на прадпрыемствах павінна быць цесна зьвязана з нашымі чарговымі палітычна-гаспадарчымі задачамі і з жыцьцём прадпрыемства. Мы павінны поўнасьцю выкарыстаць усе формы індывідуально-групавой работы сярод рабочага актыву, вылучаючы на гэтую работу больш кваліфікаваных, вытрыманых, аўтарытэтных сярод рабочай масы камуністых. Вытворчыя парт'ячэйкі павінны шырэй уцягваць беспартыйных рабочых у штодзенную практычную грамадзкую вытворчую работу, нагружаць іх грамадзкімі абавязкамі. У далейшым мы павінны рашуча ўзяцца за паляпшэньне масава-выхаваўчай работы сярод работніц і батракох, прыняць усе захады па ўцягненьні іх у партыю. На тых прадпрыемствах, дзе ёсьць вялікая праслойка рабочых (фабрыка запалак «Чырвоная Бярэзіна» і інш.), мы павінны карэнным чынам зьмяніць правядзеньне выхаваўчай работы сярод камуністак і беспартыйных работніц. Камуністкі-работніцы павінны сьмялей вылучацца на кіруючую работу, у ячэйках у якасьці сакратароў ячэек, эпоргаў, на кіруючую гаспадарчую і прафэсыянальную работу і г. д. Дэлегацкія сходы зьяўляюцца аднэй з крыніц росту партарганізацый за лік жанчын-работніц і батрачак. Раённым камітэтам і ячэйкам трэба палепшыць кіраўніцтва работай дэлегацкіх сходаў.

Ячэйкі неадкладна павінны сваёй практычнай работай забясьпечыць уцягненьне ў партыю с.-г. рабочых і батракоў. Па ўсіх саўгасах і калгасах павінны быць арганізаваны парт'ячэйкі і кандыдацкія групы.

Праз прафорганы, культурна-асьветныя ўстановы парт'ячэйкі павінны праводзіць узмоцненую падрыхтоўку батрацкага актыву. У гэтым сэнсе вялікую дапамогу могуць аказаць арганізацыя курсаў трактарыстых, прафактыву і спэцыяльнай сеткі палітшкол і палітгурткоў для батрацтва і с.-г. рабочых. Гэта значна павялічыць рост вясковых парт'ячэек за лік батракоў і с.-г. рабочых.

Пры выкананьні гэтай важнейшай дырэктывы партыі нам трэба папярэдзіць які-б та ні было мэханічны падыход і кампанейскія мэтады ў справе вярбоўкі рабочых у партыю.

Учора на дзенным пасяджэньні пленум заслухаў даклад т. Дамброўскага аб чыстцы партарганізацыі. Па дакладу разгарнуліся ажыўленыя спрэчкі.

Ці выконваюць савецкія ячэйкі КП(б)Б дырэктывы партыі ў штодзеннай рабоце

Кожная савецка ячэйка павінна стаць сапраўдным барацьбітом за пралетарска-клясавы, танны, гібкі, працаздольны апарат

Некалькі момантаў з работы савецкіх ячэек КП(б)Б

Полацкі акругком КП(б)Б правёў выбарчае абсьледваньне савецкіх ячэек партыі. Абсьледваньне гэта праводзілася, галоўным чынам, каб праверыць, як выконваюцца савецкімі ячэйкамі дырэктывы партыі ў галіне паляпшэньня работы і рацыяналізацыі савецкага апарату, барацьбы з бюракратызмам, паляпшэньня абслугоўваньня наведвальнікаў, паляпшэньня работы эканомкамісій і нарад, зьніжэньня 20 проц. адміністрацыйна-гаспадарчых выдаткаў і інш. Што-ж выявіла гэта абсьледваньне?

Ва ўнутрыпартыйнай рабоце савецкіх ячэек галоўнае месца займае прапрацоўка бягучых унутрыпартыйных пытаньняў—пастановы кангрэсу Камінтэрну, лістападаўскага пленуму ЦК, XII-га зьезду КП(б)Б і інш. Прычым ячэйкі пры распрацоўцы гэтых пытаньняў абмяжоўваюцца вынясьненьнем агульных пастаноў, ня ўвяваюць іх з практычнымі задачамі работы і не паказваюць на канкрэтныя шляхі рэалізацыі прапрацаваных пастаноў.

Работа ячэек пастаўлена **ня плянава.** Так, ячэйка пры акрфа праводзіла свае сходы па 1-2 разы ў месяц. Пляны работ ячэек ня зусім рэальныя. У ячэйцы акраа плян ня мае пэрспэктыў для выкананьня, бо пералічаныя ў ім галіны работы ўнесены, ня ўлічваючы магчымасьцяй, ці можна іх выканаць. **Падрыхтоўка пытаньняў** да агульных сходаў праводзіцца дрэнна, пастановы па больш важных пытаньнях наперад не падрыхтоўваюцца і не прапрацоўваюцца.

Кіраўніцтва мясцкомамі і групкомамі слабое, асабліва па часьці эканамічнай і масавай работы. Напрыклад, ячэйка ЦРК на працягу году заслухала толькі адзін даклад фракцыі групкому. Выканаьне прынятых пастаноў па справаздачных дакладах фракцый групкомаў і мясцкомаў не правяраецца. Многія ячэйкі дакладаў аб рабоце мясцкомаў і групкомаў зусім не заслухоўвалі. Удзел партыйцаў і камсамольцаў у прафрабоце слабы. Па ячэйцы ЦРК толькі 20-30 проц. партыйцаў наведвае прафсходы і то нерэгулярна.

Калі **самакрытыка** правільна разгортваецца ва ўнутры-ячэйкавай рабоце, дык зусім слаба разгорнута яна сярод беспартыйных працаўнікоў. Асобныя факты гэта пацьвярджаюць. Калектыў супрацоўнікаў аддзяленьня спажывецкага саюзу на агульным сходзе абгаварыў пытаньне аб бюракратычных і грубых адносінах намесьніка загадчыка аддзяленьня да наведвальнікаў і супрацоўнікаў. Была пры гэтым выказана агульная думка аб прыцігненьні яго да адказнасьці, але гэту пастанову ня выканалі. Камісія па самаправерцы ў сваіх вывадах зазначала, што судовыя працаўнікі баяліся і баяцца крытыкаваць. Гэты пункт поўнасьцю прыняты сходам. Ячэйка нічога не зрабіла, каб праверыць гэтыя факты. Па некаторых ячэйках за апошні час заўважваецца, што пытаньне разгортваньня самакрытыкі адыходзіць на задні план, асабліва гэта відаць з пастаноў ячэек і агульных сходаў.

У некаторых ячэйках наглядаюцца вынадкі, калі асобныя кіраўнікі ўстаноў ня хочуць лічыцца з ячэйкамі. На практыцы гэта выяўляецца ў непаведамленьнях ячэйкі аб пасяджэньнях фракцый установ, ня прыцягваюцца ячэйкі да складаньня пляну работы тэй ці іншай установы, ігнаруюцца пастановы ячэек. Вялікім недахвагам у рабоце савецкіх ячэек трэба лічыць тое, што частка ячэек не надае пэўнага значэньня партыйна-масавай і культурнай рабоце сярод беспартыйных супрацоўнікаў. Дрэнна і тое, што некаторыя ячэйкі ніяк дагэтуль ня могуць разьмежаваць функцыі ячэйкі ад функцый АК у справе кіраўніцтва акруговымі ўстановамі і часта па пытаньнях унутраной работы ўстаноў склад апарату і інш. спасылаюцца на тое, што гэта справа не ячэйкі, а акругкому.

Дырэктыва партыі аб тым, што асновай усёй работы савецкіх ячэек павінна быць усямерная барацьба супроць бюракратызму, паляпшэньне і рацыяналізацыя апарату, ячэйкамі слаба праломлена ў штодзеннай рабоце.

Кіраўніцтва ячэек справай барацьбы супроць бюракратызму, і іншых недахопаў савецкага апарату было нездавальняючае. На прафсходах таксама канкрэтна пытаньне паляпшэньня апарату і барацьбы з бюракратызмам ня ставілася. Пастановы некаторых ячэек па пытаньнях паляпшэньня апарату надзвычайна агульныя, неканкрэтныя, у гэтых пастановах няма практычных мерапрыемстваў для тых устаноў, якія абслугоўваем сваёй работай ячэйка.

Пытаньне аб 20 проц. зьніжэньні адміністрацыйна-гаспадарчых выдаткаў абгаворана толькі часткай ячэек. Канкрэтныя факты дазваляюць без памылак сьцьвярджаць, што зьніжэньне адміністрацыйна-гаспадарчых выдаткаў прайшло ў асноўнай сваёй масе міма ўвагі і кіраўніцтва ячэек.

У падрыхтоўцы да чысткі савецкага апарату ячэйкі і саюзы пакуль што абмежаваліся толькі пастаноўкай гэтага пытаньня па агульных сходах, а канкрэтнай работы прароблена мала. Надзвычайна марудна ідзе і работа па вылучэньні. Наўкола пытаньня чысткі савецкага апарату і яго абнаўленьня вылучанымі рабочымі патрэбнай грамадзкай думкі няма. Ёсьць выпадкі, калі асобныя таварышы гавораць, што «ў нас няма каго чысьціць і няма каго вылучаць».

У справе абслугоўваньня наведвальнікаў ёсьць прыкметнае паляпшэньне ў выніку павялічэньня ўвагі ячэек да гэтага пытаньня. Аднак посьпехі, якія ёсьць ў гэтым напрамку ні ў якім разе нельга прызнаць здавальняючымі. Частка ячэек, як ЦРК, акрэа і адмаддзелу, не займаліся пытаньнем абслугоўваньня наведвальнікаў установ, між тым, як рад фактаў сьведчыць аб няўважлівых адносінах да паданых скаргаў і інш.

Эканомкамісіі і нарады працуюць нерэгулярна, да іх работы ня прыцягнуты шырокія колы супрацоўнікаў установ. Толькі невялічкая частка эканомкамісій здолела сяк-так арганізаваць сваю работу, але, на вялікі жаль, некаторыя посьпехі ў іх рабоце амаль ня ўлічаны і надзвычайна мала распаўсюджаны па ўсіх эканомкамісіях (не наладжаны абмен практыкай работы).

* * *

Мы лічым патрэбным адзначыць, што ў працы савецкіх ячэек ёсьць і рад практычных дасягненьняў, але яны не кампэнсуюць тых недахопаў, якіх так многа ў рабоце ячэек. Канцэнтруючы ўвагу на адзначаных недахопах, маем на ўвазе, што зараз, у сувязі з чысткай савецкага апарату, работа савецкіх ячэек набывае яшчэ большае значэньне і патрабуе неадкладнага паляпшэньня.

ПУШЫН.
АЛ. ЛЕБЕДЗЕЎ.

Кругом кепска...

(ГОРАЦКАЯ ЯЧЭЙКА КП(б)Б, АРШАНШЧЫНА)

Камуністых, якія працуюць у раённых установах, ахапляе сабою местачковая ячэйка, з работы апошняй мы заканчаем некалькі момантаў.

Перш за ўсё, як ячэйка вяла барацьбу супроць бюракратызму ў тых установах, якія яна абслугоўвае?

У гэтых адносінах ячэйка, ня гледзячы на факты цеганіны і бюракратызму ў некаторых раённых установах, не зрабіла нічога. Сыстэматычнай выхаваўчай работы сярод беспартыйных працаўнікоў установ не вядзецца. Да чысткі савецкага апарату не падрыхтаваны, зусім нічога ня зроблена ў галіне вылучэньня рабочых і батракоў у савецкія і каапэрацыйныя ўстановы.

Чым-жа займалася тады ячэйка, калі яна нічога не рабіла для выкананьня важнейшых партдырэктыў?

Амаль на кожным сходзе ячэйкі абмяркоўваліся даклады камуністых аб рабоце раённых устаноў. Але пры абгаварэньні іх сход не падыходзіў глыбока да пытаньня, абмінаў галоўнае і важнае на сёнешні дзень.

Пастановы XII зьезду КП(б)Б у ячэйцы не распрацаваны, некаторыя партыйцы слаба разумеюць сутнасьць і карэньні правага ўхілу, а ячэйка мала апоціцца аб бальшавіцкім выхаваньні сваіх членаў.

У ячэйцы ёсьць адзін рабочы, на якога ячэйка не зьвярнула адпаведнай увагі, не нагрузіла яго работай. І ён адарваўся ад жыцьця ячэйкі.

Нічога не зрабіла ячэйка і ў галіне работы сярод местачковай беднаты.

Ул. СТРЫГОЦКІ.

Рэвалюцыйнае пачынаньне мас—гарантыя посьпехаў

Няпісьменны, някультурны, не зразумеўшы клясавых задач рабочы ня можа быць актыўным будаўніком сацыялізму (з пастановы XII-га зьезду КП(б)Б). Таму справа ліквідацыі няпісьменнасьці павінна разглядацца, як найважнейшая клясавая задача. Гэту задачу мы пачынаем ўжо праводзіць у жыцьцё.

Па ініцыятыве працоўных пры самым непасрэдным удзеле і кіраўніцтве акругкому, Гомельская акруга выступіла ў культпаход на барацьбу з няпісьменнасьцю. Пач

Праверым выкананьне аграмінімуму

МЕСЦА АГРАМІНІМУМУ Ў СПРАВЕ ПАВЫШЭНЬНЯ ЎРАДЖАЙНАСЬЦІ

Для таго, каб павысіць ураджайнасьць, трэба няўхільна разгортваць індустрыялізацыю краіны, на аснове апошняй рашуча праводзіць сацыяльна-тэхнічную рэканструкцыю сельскай гаспадаркі і адначасова шырока ўжываць агратэхнічныя мерапрыемствы. Агратэхнічныя мерапрыемствы можна згрупаваць у наступныя асноўныя 5 групі: 1) мерапрыемствы зьвязаныя з рэарганізацыяй севазвароту; 2) вымены мэтадаў і прыёмаў апрацоўкі глебы; 3) паляпшэньне насеннага матар'ялу; 4) паляпшэньне ўгнаеньня глебы; 5) барацьба са шкоднікамі.

Зусім зразумела, што рашаючае слова ў справе павышэньня ўраджайнасьці застаецца за індустрыяй і за мерапрыемствамі, якія ажыцьцяўляюць сацыяльна - тэхнічную рэканструкцыю сельскай гаспадаркі. Менавіта, рост абагуленага сэктару сельскай гаспадаркі (саўгасы, калгасы), забесьпячэньне з боку прамысловасьці машынамі, мінэральнымі ўгнаеньнямі, сродкамі барацьбы са шкоднікамі.

Вось галоўнае, што павінна забясьпечыць няўхільны ўздым ураджаю.

Аднак, гэта зусім ня можна разумець так, што ў справе барацьбы за ўраджай бядняцка-серадняцкія гаспадаркі не павінны як мага больш старацца выкарыстаць свае ўнутраныя магчымасьці і рэсурсы.

Вось чаму закон саюзнага ўраду аб павышэньні ўраджайнасьці, даючы заданьне на 5 год і вызначаючы галоўныя мерапрыемствы, якія забясьпечаць гэты ўздым, поруч з гэтым адзначае:

«З посьпехам справіцца з гэтай запустазельля, насеньне якога ёсьць у дачай (павялічэньнем ураджайнасьці. М. Ш.) можна толькі пры шырокім ужываньні ў бліжэйшыя гады асноўнай масай бядняцкіх ды серадняцкіх гаспадарак найпрасьцейшых, даступных і для дробных гаспадарак агрыкультурных мерапрыемстваў, што можа значна павялічыць ураджайнасьць параўнаўча ў кароткі час».

Адтэуль зразумела месца і значэньне ў справе павышэньня ўраджайнасьці прасьцейшых прыёмаў агратэхнікі.

Абавязковасьць-жа гэтых прыёмаў (абавязковы аграмінімум) вынікае з неабходнасьці як мага хутчэй перамагчы інэртнасьць тых неарганізаваных элемэнтаў насельніцтва, якія па сваёй цемнаце ці па сацыяльным становішчы (кулакі і іх падпявалы) затрымліваюць фактычнае правядзеньне агратэхнічных мерапрыемстваў усёй масай сялянскіх гаспадарак. Апрача таго, аб абавязковасьці аграмінімуму выказалася балдай усё перадавое сялянства. На грунце гэтага СНК БССР і выдаў 19 сакавіка г. г. пастанову «пра ўвядзеньне абавязковых для зямлякарыстальнікаў агрыкультурных палепшаньняў у сельская гаспадарцы». Сёлета, такім чынам, мы першы год праводзім абавязковы аграмінімум ва ўсёй масе сялянскіх гаспадарак. Ад таго, як будзе арганізавана справа ў гэтым годзе будзе залежаць разгортваньне (а значыць і павялічэньне ня толькі аб'ёму, але і колькасьці мерапрыемстваў) аграмінімуму ў наступныя гады. Таксама ў значнай меры будзе залежаць павышэньне ўраджайнасьці, якое павінна быць для гэтага году: у індывідуальных сялянскіх гаспадарках ня менш як на 7 проц., у савецкіх і калектыўных гаспадарках—на 12 проц.

КАЛІ АГРАМІНІМУМ ДАСЬЦЬ ЭФЭКТ?

Фактычна аграмінімум мы сталі праводзіць, рыхтуючыся да веснавой сяўбы. Ачышчэньне насеньня, пратручваньне насеньня для зьнішчэньня галаўні, зьбіраньне, захаваньне і скарыстаньне попелу на ўгнаеньне—гэтыя мерапрыемствы сёлета былі праведзены ў значна больш шырокім параўнальна з папярэднімі гадамі аб'ёме. Але яны (гэтыя мерапрыемствы) яшчэ не складаюць аграмінімуму. Пад апошнім трэба разумець **цэлы комплекс** прасьцейшых агратэхнічных мерапрыемстваў, калі адначасова ў гаспадарцы ўжываецца некалькі прасьцейшых мерапрыемстваў.

Толькі тады мы можам гаварыць, што аграмінімум праводзіцца, і толькі тады ён дае належны эканамічны эфэкт. Гэта значна забясьпечвае ўздым ураджайнасьці.

У гэту вясну мы мелі магчымасьць назіраць няправільнае разуменьне аграмінімуму. У радзе раёнаў, сельсаветаў справу прабавалі зьвесьці да ачысткі насеньня і збору попелу. Былі нават і такія месцы, дзе ўсю падрыхтоўку да сяўбы меркавалі зьвесьці да гэтых двух мерапрыемстваў. Ня кажучы аб апошнім, як выразным глупстве, мы ня можам, аднак, абмінуць і такой трактоўкі, што два ці тры мерапрыемствы складаюць аграмінімум.

Для прыкладу возьмем ачыстку насеньня. Гэта мерапрыемства толькі тады дасьць эфэкт, калі поруч з давяднным ачысткі насеньня да 100 проц. мы шырока разгорнем барацьбу з пустазельлем. Можна ачышчаным насеньнем засяваць поле, але калі ня зьнішчыць зямлі, калі не абкошваць палявых дарог, меж і канаў, якія зьяўляюцца рассаднікамі пустазельля, то эфэкт ад ачысткі будзе дужа нізкі.

Таксама будзе зьнікацца эфэкт і ад гатункавага насеньня, калі ня будзе праводзіцца барацьба з пустазельлем. Падобны прыкладаў можна падаць шмат. РСІ СССР, праводзячы дасьледваньне перадавых сялянскіх гаспадарак у сувязі з пытаньнем павышэньня ўраджайнасьці, адзначае, што **«ўсе мерапрыемствы па ўздыме ўраджайнасьці ў абсьледваных гаспадарках ідуць у пэўным злучэньні. Мы бадай не знайшлі такіх гаспадарак, якія ўжывалі-б адно якое-небудзь мерапрыемства».**

Комплекс мерапрыемстваў, якія праводзяцца адначасова, вось як трэба разумець аграмінімум, вось калі ён дае належны эканамічны эфэкт.

АГРАМІНІМУМ Ў АГРАМАДЖАНЫМ СЭКТАРЫ СЕЛЬСКАЙ ГАСПАДАРКІ

Было-б памылковым гаварыць аб тым, што ўжываньне комплексу прасьцейшых агратэхнічных мерапрыемстваў датычыць толькі індывідуальных сялянскіх гаспадарак.

Зразумела, тэхніка вядзеньня сельскай гаспадаркі ў саўгасах і калгасах вышэйшая, чым у дробных сялянскіх гаспадарках, забесьпячэньне сродкамі вытворчасьці таксама значна вышэйшае. Але тымчасам нават у саўгасах мы бачым, што часта прасьцейшыя агрыкультурныя мерапрыемствы ня ўжываюцца. Прычына гэтаму—неахайнасьць і нядбайнасьць кіраўнічага складу саўгасаў.

Робячы апрацоўку зямлі складанымі машынамі, уносячы ў выстарчальнай колькасьці мінэральныя ўгнаеньні, засяваючы поле гатунковым насеньнем, і г. д. кіраўніцтва саўгасу часта выпускае з-пад увагі такія мерапрыемствы, якія, бадай, не патрабуюць ніякіх сродкаў, ці часамі дужа малыя сродкі для іх ужываньня. Патрабуючы ад шырокіх колаў сялянскіх гаспадарак выкананьня аграмінімуму, мы ў першую чаргу павінны дамагацца выкананьня аграмінімуму сацыялістычным сэктарам сельскае гаспадаркі (саўгасамі і калгасамі). У законе СНК і вызначана 14 мерапрыемстваў, якія павінны абавязкова праводзіцца саўгасамі, камунамі і арцелямі.

Разгортваючы работу па аграмінімуме, правяраючы зараз, як выканана і выконваецца пастанова СНК, трэба ў першую чаргу праверку зрабіць у адносінах саўгасаў, калгасаў і арцеляй.

Белсельтрэст і Белкалгассаюз павінны даць як належныя дырэктывы, так і ажыцьцяўіць праверку выкананьня іх. Але, не чакаючы «загадаў эльверху», на мясцох праверка выкананьня ўжо павінна ісьці. Райвыканкомы, сельсаветы, аграномічны пэрсанал у раёне сваёй дзейнасьці павінны абсьледваць кожны саўгас, калгас і арцель і там, дзе закон аб аграмінімуме ня выконваецца, падштурхнуць яго выкананьне, а дзе выразна відаць, што не жадаюць яго выконваць, ужываць тыя пакараньні, якія вызначаюцца пастановай СНК.

Падбухторшчыкамі аграмінімуму павінен быць сацыялістычны сэктар сельскае гаспадаркі, і таму ў праверцы выкананьня, а таксама і ў штуршку там, дзе гэта патрэбна, першая ўвага павінна быць яму.

АГРАМІНІМУМ У СЯЛЯНСКІХ ГАСПАДАРКАХ

Колькасьць абавязковых мерапрыемстваў для сялянскіх гаспадарак значна меншая. Аднак, і тут мерапрыемствы для насёлкаў і для незямляўпарадкаваных гаспадарак розныя.

Мерапрыемствы, якіх райвыканкомы могуць патрабаваць да выкананьня ад насёлкаў, бадай тыя самыя, што і ад калгасаў, за выключэньнем 2-3 больш складаных. Прычына гэтаму ясная. На зямляўпарадкаваньне і крэдытаваньне насёлкаўцаў дзяржавай затрачаны значныя сродкі, і таму дзяржава павінна патрабаваць ад гэтых гаспадароў больш культурнага вядзеньня гаспадаркі.

Рэшта гаспадарак у абавязковым парадку павінна ўвесьці в гэтага году наступныя агрыкультурныя палепшэньні: а) **ачышчэньне насеньня, б) пратручваньне насеньня, заражанага галаўнёй, в) абкошваньне да часу красаваньня пустазельля межаў, палявых дарог і канаў; г) забарону пасьвіць жывёлу на сенажацях раньняю вясною і позьняю восенью і ва ўсякі час на азімых пасевах; д) забарону выпускаць сьзіней на сенажаць, е) зьбіраньне, захаваньне і скарыстаньне попелу на ўгнаеньне, ж) зьнішчэньне хмызьняку і куп'я на сенажацях, з) спуск вады з палёў.**

Як відаць, мерапрыемствы дужа простыя і не патрабуюць для правядзеньня, бадай, ніякіх сродкаў (акрамя ўласнай працы). Справа толькі ў тым, каб гэтыя мерапрыемствы праводзіла **ўся маса сялянскіх гаспадарак.**

Пералічаныя вышэй мерапрыемствы, абавязковыя для сялянскіх гаспадарак, могуць быць павялічаны райвыканкомамі ў залежнасьці ад мясцовых умоў і ступені гаспадарчай падрыхтаванасьці насельніцтва.

Можа быць таксама павялічаны лік мерапрыемстваў у сувязі з правядзеньнем кантрактацыі, а таксама пры вытворчым крэдытаваньні. Апошняе запатрабаваньне аграмінімуму пры вытворчым крэдытаваньні ўводзіцца сёлета згодна пастановы СНК СССР.

ПРАВЯДЗЕНЬНЕ АГРАМІНІМУМУ — ВАЖНЕЙШАЯ ЗАДАЧА НА ЛЕТА І ВОСЕНЬ

Вышэй адзначалася, што, рыхтуючыся да веснавой сяўбы, мы праводзілі рад мерапрыемстваў, якія ўваходзяць у аграмінімум. Але для ажыцьцяўленьня аграмінімуму трэба правесьці цэлы комплекс мерапрыемстваў, каб атрымаць эфэкт. Матар'ялы апошніх праверак вынікаў веснавой сяўбы па Віцебшчыне і Меншчыне паказваюць, што далейшай работы па разгортваньні аграмінімуму на вёсцы няма. Аб аграмінімуме, відаць, успомняць восенью ў часе сяўбы. Тыя-ж мерапрыемствы, якія трэба праводзіць на працягу ўсяго лета, могуць быць забыты.

Пагражаючае становішча з аграмінімумам прымушае зараз-жа распачаць шырокую праверку выкананьня яго. Райвыканкомы, сельсаветы, аграўпоўнаважаныя, аграномічны пэрсанал, нарэшце, увесь савецкі актыў вёскі практычна павінны разгарнуць працу па праверцы выкананьня аграмінімуму і па разгортваньні мерапрыемстваў, якія ўваходзяць у яго. Праверка павінна ахапіць як сацыялістычны сэктар сельскай гаспадаркі, так і ўсю масу індывідуальных сялянскіх гаспадарак. Праверку трэба пачаць не з накладаньня штрафаў за невыкананьне, **а з мабілізацыі думкі шырокіх колаў сялянства вакол катэгарычнай неабходнасьці правядзеньня аграмінімуму.** Штрафы і пакаранні павінны ў першую чаргу быць накіраваны супроць тэй кулацкай часткі вёскі, якая сьвядома не праводзіць аграмінімуму, каб сарваць мерапрыемствы па ўздыме ўраджайнасьці. Сялянскім газэтам—**«Беларуская Вёска», «Чырвоная Полаччына», «Магілеўскі селянін»** і інш.—**на** сваіх старонках трэба шырока асьвятляць, як ідзе правядзеньне аграмінімуму. Для гэтага трэба думку селькораў таксама мабілізаваць вакол гэтага пытаньня.

Нарэшце, камсамол, з посьпехам працаваўшы на падрыхтоўцы да веснавой сяўбы, не павінен стаяць у баку ад гэтай работы. Дзесяткі тысяч вясковых камсамольцаў—вялікая армія. Каб правесьці аграмінімум як у сваіх гаспадарках, так і ў гаспадарках сваіх бацькоў, а боку камсамолу патрэбна ўпартая штодзенная работа.

Сацыялістычнае спаборніцтва на лепшае правядзеньне аграмінімуму ў пасёлку, вёсцы, сельсавеце — таксама дасьць моцны штуршок у гэтай справе.

Увага аграмінімуму! Ад яго ў пэўнай меры залежыць ураджай як гэтага, так і бліжэйшых гадоў.

М. ШРЭЙДЭР.

Сацыялістычнае спаборніцтва на вёсцы

Першыя посьпехі

Вёскі і пасёлкі ўступаюць у спаборніцтва

Як глускі камсамол змагаецца за сацыялістычную вёску

У апошні час у сацыялістычнае спаборніцтва пачынаюць уступаць асобныя вёскі і пасёлкі.

Ініцыятыву ў гэтай справе, як правіла, праяўляюць тыя вёскі і пасёлкі, якія ў веснавую пасеўную кампанію ўжылі ў сябе рад новых аграномічных мерапрыемстваў.

Больш за ўсё раскалыхалася Бабруйская акруга, дзе ў спаборніцтва прымае ўдзел больш дзесятка вёсак і пасёлкаў.

Пасёлкі «Перамога» і імя т. Дзяржынскага, якія ўступілі ў сацыялістычнае спаборніцтва з суседнімі вёскамі і пасёлкамі, ужо дабіліся значных посьпехаў. Яны ачысьцілі 100 проц. насеньня і пратруцілі яго ад галаўні, арганізавалі насенаводнае таварыства, малочную арцель і малочны зьліўны пункт.

Пасёлак Жоркаўка перайшоў на 8-мі палёвы севазварот і поўнасьцю ачысьціў і пратруціў усё сваё насеньне.

Глуская раённая арганізацыя ЛКСМ выклікала на сацыялістычнае спаборніцтва суседнюю Парыцкую камсамольскую арганізацыю. Глускія камсамольцы на практыцы паказалі, якімі павінны быць новыя формы работы камсамолу ў барацьбе за сацыялістычную вёску. Сіламі райкому і ячэек праведзены 52 сходы сялянскай моладзі па пытаньні аб аграмінімуме і павышэньні ўраджайнасьці.

Сіламі камсамольцаў арганізаваны спэцыяльная камсамольская с.-г. камуна, куды ўвайшло 35 камсамольцаў, 7 с.-г. вытворчых аб'яднаньняў. Акрамя таго, 25 камсамольцаў уступіла ўновыя і старыя с.-г. арцелі і камуны, тры камсамольскія ячэйкі працуюць зараз над арганізацыяй новага камсамольскага калгасу. Па ініцыятыве глускіх камсамольцаў закладзена 7 паказальных вучасткаў, створана 9 с.-г. гурткоў.

Урэшце, дзякуючы няўхільнай дзейнасьці камсамолу, увесь Глускі раён выканаў заданьне па ачыстцы насеньня на 220 проц., сабраў каля 200 тон попелу.

Глуская камсамольская арганізацыя паставіла зараз перад сабою новую задачу: арганізаваць чатыры калгасы, стварыць 5 вытворчых аб'яднаньняў, арганізаваць 8 с.-г. гурткоў, перавесьці на агульнае харчаваньне адзін калгас, уцягнуць у калгасы 25 чалавек камсамольцаў і сялянскай моладзі.

Трактар зрабіў рэвалюцыю ў вёсцы

(МАЗЫР)

Пяць год таму назад у вёсцы Дамановічах (Калінкавіцкі раён) арганізаваўся калгас. Тады мясцовыя сяляне яшчэ баяліся ўступаць у гэты калгас, сёй-той яшчэ разважаў—«а можа назад пан вернецца...». І калгас укамплектаваўся з сялян іншых вёсак.

Паны ня прышлі. Калгасьнікі працавалі інтэнсыўна, вясною гэтага году калгас перайшоў у камуну «Авангард». Навакол гэтай камуны пачалі арганізоўвацца калгасы. Сярод сялян бліжэйшых вёсак пашлі гутаркі ды разважаньні—«дурні мы, што не пайшлі тады ў калгас, як добра яны зараз там жывуць». Трактар, які вясною гэтага году зьявіўся ў камуне, яшчэ больш уварушыў сялянства наўкольных вёсак, навакол трактара стваралася сярод сялянства цэлыя легэнды.

— Трактар—гаворадь сялянкі—выкарчоўвае пні, скача праз балоты, ён і арэ, ён і малоціць...

Беднота і актыўныя сераднякі вёскі Халодніці (больш за 300 двароў) пачалі весьці ўзмоцненую кампанію за далучэньне ўсёй вёскі да камуны.

— Ня хочам арганізоўваць калгас, мы хочам далучыцца да камуны. Там ёсьць добрыя арганізатары, там ёсьць практыка ў рабоце,—гаворадь сяляне.

Сяляне вёскі Лампекі (Даманавіцкі сельсавет) вынесьлі на сваім агульным сходзе пастанову аб тым, каб у гэтым годзе і надалей тройку не сьвяткаваць, а замест гэтага сьвята ўсёй вёскай направіць дарогі і арганізаваць культурнае сьвята.

Б. Ш.

Першая ластаўка спаборніцтва на палёх Аршаншчыны

(ВОРША)

Да гэтага часу спаборніцтва на палёх Аршаншчыны яшчэ ня было разгорнута, акруга спазьнілася з гэтай работай. Зараз спаборніцтвы пачаліся ў калгасах.

Першай уступіла ў спаборніцтва камуна «Імя дзесятай гадавіны Кастрычнікавай рэвалюцыі» (Аршанскага раёну). Гэта камуна выклікала на спаборніцтва дзьве іншыя камуны: «Шлях селяніна» (Мсьціслаўскага раёну) і «Араты» (Расьнянскага раёну).

Распрацавана і прынята 13 умоў спаборніцтва.

Арганізавана камісія, якая павінна будзе паехаць 8 лістапада ў выкліканыя камуны і праверыць, ці выкананы імі ўмовы. Другая праверка будзе зроблена 2-га мая будучага году.

Гэта ўступленьне ў спаборніцтвы цікава яшчэ тым, што камуна «10-ты Кастрычнік» арганізавалася толькі ў мінулым годзе з 13 гаспадароў, на надзельнай зямлі. Камуна пабудавала ўжо памяшканьне пад сталоўку, агульную абору для жывёлы, мае сыраварны завод і майстэрню па вырабе чарапіцы, бэтону і інш.

А. М.

На варце СССР

Сацыялістычнае спаборніцтва ў Чырвонай армії

Асноўная задача — павышэньне баявой падрыхтоўкі войск

Якую мэту мае сацыялістычнае спаборніцтва ў Чырвонай армії? Узмацніць удзел чырвонаармейцаў у рэканструкцыі сельскай гаспадаркі, у арганізацыі калгасаў? Зразумела, гэта адна з задач сацыялістычнага спаборніцтва ў Чырвонай армії. Але ёю абмяжоўвацца ні ў якім разе нельга. Вось чаму вельмі памылковай і галавацяпскай трэба лічыць заяву аднаго камандзіра, які на запытаньне адносна тактычнай падрыхтоўкі войск адказаў: «Мы заняты сацыялістычным спаборніцтве, гэта перашкаджае вайсковай вучобе».

Будаўніцтва абароны СССР і баявая падрыхтоўка войск, у прыватнасьці, ёсьць важная частка агульнага вялікага працэсу сацыялістычнага будаўніцтва. Узмацняючы ваенную моц СССР, мы гэтым самым забясьпечваем бесперабойнасьць сацыялістычнага будаўніцтва. Спаборніцтва ў Чырвонай армії павінна ісьці на шляху паляпшэньня дысцыпліны, быту і службы, а таксама баявой падрыхтоўкі войск.

Пашырэньне вайсковых ведаў, павышэньне тактычнай падрыхтоўкі войск—важнейшая задача сучаснага пэрыяду. Гэта задача ня можа быць вырашана бяз поўнага, усебаковага і сьвядомага ўдзелу ў вучобе ўсёй масы радавога і начальніцкага складу. Для вырашэньня гэтай задачы трэба арганізаваць дзелавы энтузіязм, стварыць такія грамадзкія настроі сярод чырвонаармейцаў, якія-б садзейнічалі разгортваньню сацыялістычнага спаборніцтва па ўсіх галінах баявой вучобы.

Спаборніцтва дасьць магчымасьць дабіцца большага павышэньня дысцыпліны, узмацненьня рэвалюцыйна-клясавай сьвядомасьці чырвонаармейцаў і камандзіраў, павышэньня тактычнага мастацтва начальнікаў і войск. Спаборніцтва павінна садзейнічаць вышуканьню найбольш прадукцыйных мэтадаў стралкова-кулямётнага навучаньня. **Задача ўсіх арганізацый—усямерная дапамога ініцыятыве чырвонаармейскіх мас у сацыялістычным спаборніцтве.**

С.

Чырвонаармейцы ў лягерах

Калі чырвонаармейцы № артпалку прыехалі ў густы лес, дзе павінны былі быць разьмеркаваны нашы лягеры, то некаторыя з іх выказвалі такія думкі:

— Хіба-ж можна тут жыць і праводзіць заняткі, няхай-бы лепш заставаліся ў казармах і там вялі заняткі.

Але такія разнавы пасобныя чырвонаармейцаў цягнуліся дзень, два. Рэшта чырвонаармейцаў і камандзіры растлумачвалі, што ня варта падаць духам і ўсё будзе добра.

І сапраўды праз некалькі дзён уся лягерная абстаноўка зусім зьмянілася. Зьявіліся безапалатныя „хаткі". Наўкола чыстата, туміць лес, у кожным кутку лягеру чутны песьні чырвонаармейцаў. Пашло новае жыцьцё, якое яшчэ больш захапляе чырвонаармейцаў і паддае ахвоты да заняткаў.

Пры лягерах абсталявана кухня. Менш ідзе хлеба ў глум, чым гэта было ў казармах. Якасьць хлеба добрая.

Адным словам наша лягернае жыцьцё вельмі цікавае. Акрамя стральных чырвонаармейцы наведваюць палітзаняткі, дзе прапрацоўваюцца пастановы XVI партканфарэнцыі. У лягеры выпісваецца шмат усякіх газэт, якія чырвонаармейцы з асаблівым інтарэсам чытаюць, але трэба побач з індывідуальным чытаньнем наладзіць і галосную чытку.

Ня меншая зацікаўленасьць з боку чырвонаармейцаў і да кнігі.

У нашым палку за два дні было пашырана сярод чырвонаармейцаў па бяспройгрышнай лётарэі больш за 1000 15 капеечных білетаў на кнігі. Гэта для нас вялічае дасягненьне. Адна бяда, няма блізка для лягераў рэчкі. Але і гэты недахоп скора будзе зьнішчаны. Мае быць неўзабаве пабудавана лазьня для чырвонаармейцаў і вадаправод.

Чырвонаармеец Імшара.

Сёньня 3-га чэрвеня а 12 гадзіне дня ў залі гасподзьняньняў Савету Народных Камісараў БССР

склікаецца

ПЛЕНУМ КАМІТЭТУ ХЭМІЗАЦЫІ

народнай гаспадаркі пры СНК БССР.

—) ПАРАДАК ДНЯ: (—

1) Адбіцьцё працэсу хэмізацыі у 5-цігадовым пэрспэктыўным плане народнай гаспадаркі БССР. (Дакл. інж. В. С. НАТАНСОН).

2) Тэрпавыя рэсурсы у БССР і пэрспэктывы хэмічнага скарыстаньня торпу. (Дакл. інж. А. М. РОЗІН).

3) Пра культуру цукровых бурачоў і пэрспэктывы арганізацыі прамысловага цукраваральня ў БССР. (Дакл. праф. А. В. КЛЮЧАРОЎ).

4) Інфармацыя пра дзейнасьць і плян

Прэзыдыюм Камітэту па хэмізацыі.

ГАЛАВАЦЯПЫ НОВАГА БУДАЎНІЧАГА СЭЗОНУ

САРВАНЫ РАБОТЫ ПА КАНАЛІЗАЦЫІ

Камгас ня выканаў дырэктыў ураду.--Вадаканал праявіў нячуванае галавацяпства і бюракратызм.--Вінаватыя прыцягваюцца да крымінальнай адказнасьці

Менск яшчэ ня бачыў такога факту галавацяпства, які здарыўся на каналізацыйных работах. Насельніцтва Менску ведае, як тыдняў два таму назад Савецкая вуліца была раскапана ўдоўж і ўпоперак, старая каналізацыйная ўстаноўка ў асобных дамох была разбурана, зьнішчана і найбольш ажыўлены вучастак вуліцы закрыты для праходу і праезду.

Але, наколькі работа пачалася шпаркім тэмпам, кожны быў упэўнены, што ўсё гэта хутка скончыцца. Так яно і было-б, **калі-б....**

Пачалі работу, не падрыхтаваўшы матар'ялаў

Некаторы час таму назад Вадаканал зьвярнуўся на менскую біржу працы за дазволам прывезьці з Масквы групу рабочых сьлесароў. Але пры гэтым Вадаканал нават не пацікавіўся, ці ёсьць будаўнічыя матар'ялы. Ён лічыў, што паколькі ёсьць дагавор з камгасам, паводле якога апошні павінен даставіць увесь матар'ял, то матар'ял павінен быць. Замест таго, каб зайсьці ў камгас і высьветліць дасканала гэта пытаньне, працаўнікі Вадаканалу абмяжоўваліся толькі паперкамі, на якія Камгас **нават не адказваў.**

Як-жа камгас забясьпечыў каналізацыйныя работы матар'ялямі? Тут мы сустракаемся з самым грубым парушэньнем дырэктыў урадовых органаў. Была дырэктыва, каб дагавары на дэфіцытныя будаўнічыя матар'ялы былі заключаны абавязкова **да 1-га студзеня бягучага году.** Але для камгасу гэта дырэктыва не абавязкова. Ён заключыў дагавор на дастаўку матар'ялу толькі ў сакавіку гэтага году. Зразумела, што гэты ляпсус зрабіў адмоўны ўплыў на ўвесь ход работ.

Рабочыя прыехалі і... паехалі

Дазвол ад біржы працы на тое, каб прывезьці маскоўскіх сьлесароў. Вадаканал атрымаў. Праз некаторы час 40 маскоўскіх высокакваліфікаваных рабочых прыехалі ў Менск.

Даведаўшыся пра гэта, камгас 22-га мая дае Вадаканалу нарад з прапановай зараз-жа распачаць работу, не падумаўшы нават пра тое, якія могуць быць вынікі, калі ня будзе **будаўнічых матар'ялаў.** Камгас, як відаць, спадзяваўся на тое, што частка матар'ялаў ужо ёсьць. Але якраз гэта частка (краны-штэйны і інш.) патрэбна для работ **у апошнюю чаргу.** матар'ялаў-жа патрэбных **у першую чаргу** (трубы і інш.), ня было.

Зразумела, распачаўшы работу, ужо праз некалькі дзён рабочым **прышлося яе спыніць.** Кваліфікаваныя рабочыя ня любяць прастояў. Таму яны патрабавалі, каб ім далі работу або накіравалі назад у Маскву.

І тут мы зноў сустракаемся з фактам галавацяпства. Не запытаўшы камгас пра далейшы лёс работ і ці хутка будуць патрэбныя матар'ялы, Вадаканал, на падставе пастановы складзенай ім камісіі, **але без прадстаўнікоў камгасу,** паслаў маскоўскіх рабочых назад у Маскву, **выплаціўшы ім за прастоі і праезд каля 3.000 руб.**

А матар'ялы пачалі выгружаць

Тым часам камгас накіраваў свайго прадстаўніка ў Маскву, каб хутчэй адсылалі матар'ялы. Зараз матар'ялы пачалі ўжо падвозіць.

Такім чынам здарылася, што матар'ялы везьлі з Масквы ў Менск, а будаўнікі ехалі з Менску ў Маскву.

І вось вынікі гэтага брыдкага галавацяпства.

Работы пакуль што сарваны, вуліцы раскапаны. Калі зноў распачнуцца работы—невядома. Кваліфікаваный рабочай сілы няма. Прычым трэба мець на ўвазе заяву маскоўскіх рабочых, што яны больш ня прыедуць і папярэдзяць іншых рабочых аб мясцовых непарадках. Гэта заява будзе зразумелай, калі ўспомніць, што і для гэтых рабочых таксама сарваны будаўнічы сэзон, бо на біржы працы яны страцілі сваю чаргу.

Вінаватых да крымінальнай адказнасьці

РСІ ўжо ўзялася расьсьледваць гэту справу. Выявілася, што найбольш вінен ва ўсім гэтым галавацяпстве Вадаканал у асобе начальніка работ і яго намесьніка. Таксама значная частка віны падае на камгас у асобе інжынэра Ківокіна.

Вынікам гэтага расьсьледваньня будзе тое, **што вінаватых прыцягнуць да крымінальнай адказнасьці.**

Але гэтага мала. Трэба прыняць усе меры, каб дабіцца дастаўкі матар'ялаў і скончыць распачатыя работы, **бо ў такім стане галоўную вуліцу Менску пакінуць нельга.**

У працэсе расьсьледваньня інспэктар РСІ выявіў яшчэ рад недахопаў. Так, напрыклад, выявілася, што набор усяго тэхнічнага і абслугоўваючага штату на каналізацыйных работах на бягучы сэзон Вадаканал **ня ўзгодніў з прафсаюзам будаўнікоў.**

Рахункавод Вадаканалу **Салабуха,** калі рабочыя зьвярнуліся да яго, каб высьветліць пасобныя пытаньні, што цікавілі іх, замест таго, каб растлумачыць іх, брыдка абляяў іх. Зусім не адпавядае свайму прызначэньню старшыня групкому, які таксама груба і няўважліва адносіўся да рабочых.

Трэба і тут пачысьціць, як след.

Пра „касавокіх" будаўнікоў дому дзяржбанку

У Менску пачалі будаваць новы дом Дзяржбанку. Для гэтага дому вызначаны самы лепшы вучастак зямлі—на рагу Ленінскай і Савецкай вуліц. Праект дому Дзяржбанку складалі ў Маскве—за яго заплачана вялікая сума грошай—каля 2 з паловаю тысяч рублёў.

Зараз выяўляецца, што праект гэты —нягодны. Прычына ў тым, што калі пабудаваць дом паводле гэтага праекту, то ён ня зьмесьціцца на вызначаным вучастку зямлі.

Як-жа здарылася такая дзікая гісторыя? І хто тут вінаваты?

Аўтар праекту, архітэктар Гольц, які жыве ў Маскве, атрымаў плян вучастку ад Дзяржбанку і на падставе гэтага пляну стаў складаць праект. І дзеля таго, што вучастак, згодна пляну, меў няправільную форму, дык тут была даволі цяжкая задача—прыстасаваць праект да формы вучастка. З задачай гэтай архітэктар Гольц справіўся ня кепска.

Белдзяржбуд, які ўзяўся будаваць банк з распрацоўкай рабочых чарцяжоў да яго, патраціў шмат часу на прапрацоўку праекту. Справа ў тым, што з прычыны няпростакутных акрэсьленьняў апрацыйнае залі, выкліканых фігурай вучастку на пляне, кожная калёна і кожная балька патрабавалі асаблівага разліку. Над гэтай справай доўга сядзелі спэцыялісты, пакуль ня справіліся з ёю. Ужо гатовы амаль усе рабочыя чарцяжы, і можна было-б будаваць.

Але вось пры перанясьненьні пляну на мясцовасьць (на мове будаўнікоў гэта называецца разьбіўкай) выявілася, што дом вылазіць за межы вызначанага вучастку. І, калі сталі высьвятляць, у чым тут прычына, схамянуліся, што паказанага крывога куту на пляне вучастку няма зусім, а ёсьць просты кут. Гэта рог Ленінскай і Савецкай вуліц быў прыняты за крывы кут, у той час, калі ён просты.

Зараз Белдзяржбуд стаіць перад пытаньнем поўнай перапрацоўкі праекту, што зьвязана з затратай часу, з затрыманьнем работ. І ясная справа, што ў сувязі з гэтай недарочнасьцю ў гэтым годзе ня ўдасца банк пачорна пабудаваць.

Вялікая работа па прапрацоўцы праекту ідзе на нітшо, з прычыны таго, што асобы, зьнімаўшыя плян вучастку, аднесьліся да сваёй работы вельмі нядбайна.

Дзіўна таксама, што архітэктар Гольц, які быў у Менску ўжо пасьля складаньня праекту і аглядаў вучастак для банку, не заўважыў разьходзін пляну з натурай, як не заўважылі гэтага і іншыя, што разглядалі праект і былі знаёмы з вучасткам. Таксама не заўважыў разьходзін пляну з натурай і акруговы інжынэр, якому праект быў паданы на разгляд. Тлумачыцца гэта, магчыма, тым, што з раньняй вясны вучастак быў агароджаны плотам і ўсе гэтыя асобы разглядалі вучастак «праз плот».

Чаму вучыць нас гэты факт? Ён яшчэ і яшчэ раз гаворыць аб тым, што ва ўсіх стадыях будаўніцтва, пачынаючы з самага пачатку, патрэбны досыць сур'ёзныя і адказныя адносіны спэцыялістых да работы, якая ім выконваецца. І асаблівая ўвага патрэбна пры здымцы пляну вучастку для будучай пабудовы, бо ад гэтага залежыць уся далейшая работа па праектаваньні і пабудове.

Інжынэрна-тэхнічным працаўніком трэба цьвёрда ўсьвядоміць, што ад іх адносін да справы залежыць лёс будаўніцтва. І таму мы маем права чакаць ад **іх максымуму ўвагі і адказнасьці за даручаную ім справу.**

КУЛІК.

Чаму яшчэ слабы грамадзкі кантроль над новым будаўніцтвам

Ня гледзячы на тое, што будаўнічы сэзон пачаўся амаль 1-1½ месяцы таму назад, яшчэ да гэтага дня пралетарская грамадзкая думка не мабілізавана вакол патрэбнасьці пільна сачыць за якасьцю выкананьня будаўнічых работ. Практыка мінулых год паказвае, што пры адсутнасьці масавага грамадзкага кантролю над будаўніцтвам, якасьць апошняга пагоршваецца, а кошт работы ўзрастае.

Аб гэтым ужо шмат пісалася. Яшчэ ў мінулым годзе ў нашых газэтах пісалася аб тым, што трэба арганізаваць вытворчыя нарады на будаўніцтвах, трэба, каб рабочыя прадпрыемстваў, у прыватнасьці дэлегаты гарсавету пастаянна сачылі за ходам будаўнічых работ.

Мы пытаемся: што зроблена сёлета ў гэтай галіне? Ці прымацаваў гарсавет сваіх дэпутатаў да асабліва буйных пабудоў для пастаяннага кантролю? Ці арганізавала ЦП саюзу будаўнікоў вытворчыя камісіі і нарады ў групкомах рабочых будаўніцтваў? Ці цікавяцца рабочыя калектывы фармзаводу, фабрыкі цукерак, Меншвэю тым, як будуюцца для іх новыя карпусы?

Нам здаецца, што на будаўнічых палянах ня ўсё добра.

Просім усіх рабкораў, усіх будаўнікоў шырока асьвятляць на стороніках друку ўсе бакі новага будаўніцтва.

Памятайце: усялякі недахват лёгка тады зьнішчыць, калі ён своячасова выяўлены.

М. Н.

На пленуме Менскага гарсавету

Вынікі V-га зьезду саветаў СССР

Даклад тав. А. Г. Чарвякова

КАНЦЭНТРАВАНЫ РОЗУМ І ВОЛЯ ПРАЦОЎНЫХ МАС

6-га чэрвеня на пленуме Менскага гарсавету з вялікім дакладам аб выніках V Усесаюзнага Зьезду Саветаў выступіў старшыня ЦВК БССР тав. **Чарвякоў.**

— V Усесаюзны Зьезд Саветаў,—кажа тав. Чарвякоў,—закончыў шырокую кампанію па перавыбарах саветаў, якая была праведзена на працягу апошніх некалькіх месяцаў. У часе справаздачных і перавыбарчых сходаў абгаварваліся тыя самыя пытаньні, што былі пастаўлены ў парадак дня V Усесаюзнага Зьезду Саветаў.

Рабочыя, сяляне, ус

Па Савецкай Беларусі

Непарадкі і цеганіна ў нарсудзе

Ворша. (Наш кар.). У Аршанскім нарсудзе, які абслугоўвае горад і раён, працуюць 3 судзьдзі—Пракаповіч, Гурар'я і Камай. Ня гледзячы на наяўнасьць 3 судзьдзяў, судовая справа была пастаўлена вельмі дрэнна. Былі выпадкі, калі на адным пасяджэньні разглядалася да 70 спраў.

Зразумела, што судзьдзі бяз увагі адносіліся да спраў і вырашалі іх абыяк.

Вось чаму ад 30 да 50 проц. прыгавораў скасаваны вышэйшымі інстанцыямі. У судзе панавала цеганіна; пасяджэньні суду адкладвалі па некалькі раз, сьведкаў трымалі дарэмна тыднямі. Былі выпадкі скажэньня судом правільнай класавай лініі.

Паводле пастановы акруду, нарсудзьдзі **Камай і Гурар'я** зьнімаюцца з працы, а **Пракаповіч** пераведзены ў іншы раён.

„Лёгкая кавалерыя"—на Асінстрої

Асінаўка. (Наш кар.). Нядаўна ў пасёлку Выдрыца адбыўся сход рабочых, на якім абгаворваліся вынікі работы атраду «лёгкай кавалерыі». Атрад дабіўся паляпшэньня водпуску хлеба, атрад выявіў непарадкі з хаваньнем спецвопраткі і сартавога жалеза; выяўлена, што на складзе без карысьці ляжыць піла, што будаўнічае бюро працуе бяз пляну, што на лініях перадачы неправільна выдаюць лес і г. д.

Сход прызнаў, што «лёгкая кавалерыя» прарабіла даволі вялікую работу.

Новыя яўрэйскія калгасы

Бабруйск. (Наш кар.). Прыступлена да арганізацыі 2 х буйных яўрэйскіх калгасаў. Адзін калгас арганізуецца ля мяст. Ціхініч, Рагачэйскага раёну, другі—у Ліпені, Сьвіслацкага раёну. У апошні час арганізаваўся буйны яўрэйскі калгас у Жлобінскім раёне на плошчы ў 600 гэктараў, які аб'ядная 3 невялікія калгасы.

Суд над 6. артыстымі-антысэмітамі

Магілеў. (Наш кар.). 2-га чэрвеня народны суд разглядаў справу 2-х артыстых БДТ-2 **Смольскага** і **Корбута**, якія абвінавачаліся ў антысэмітызьме. **Смольскі** прыгавораны да 6 месяцаў прымусовых работ, **Корбут**—да 6 месяцаў умоўна.

Менская электрастанцыя пашыраецца

У Англіі заказваецца новы турбагенэратар

Эльвод атрымаў ліцэнзію на заказ у Англіі новага турбагенэратару для электрастанцыі на 3750 клв. Дагавор будзе заключаны з ангельскай фірмай праз адзін—паўтара месяцы.

Заключаны дагавор з Белдзяржстроем на пабудову кацельнай для двух новых паравых катлоў па 400 кв. мэтраў нагрэву. Катлы заказаны Ленінградзкаму суднабудаўнічаму заводу. Катлы павінны быць дастаўлены ў Менск у працягу году.

У Маскве заказаны для станцыі новы грузапад'ёмнік для падачы торфу. Тэрмін выкананьня заказу 12 месяцаў.

Выкананьне гэтых заказаў вядзецца з такім разьлікам, каб новы турбагенэратар быў пушчаны ўвосень 1930 г. Магутнасьць станцыі будзе павялічана на 110 проц. Устаноўка новых машын дасьць магчымасьць забясьпечыць электраэнэргіяй патрэбы прамысловасьці, гораду і асьвятліць ваколіцы.

Пачаліся торфараспрацоўкі

Бабруйск. (Наш кар.). У акрузе пачаліся торфараспрацоўкі. За бягучы сэзон мяркуецца здабыць каля 31 т. тон торфу. 17 тыс. тон пойдзе на ўгнаеньне сялянскіх палёў.

Аблігацыі на хаваньне ў Дзяржбанк

Агульны сход рабочых і служачых аб'яднанай прафтэхнічнай школы разам з вучнямі, заслухаўшы інфармацыю прадстаўніка Дзяржбанку тав. Кантаровіча аб задачах і значэньні пазыкі індустрыялізацыі, пастанавіў здаць усе аблігацыі на хаваньне ў Дзяржбанк.

У зьвязку з тым, што мяркуецца выпусьціць 3-ю пазыку індустрыялізацыі, даручана камісіі садзейнічаньня распачаць належную падрыхтоўчую працу.

Пабудова вадаправоду ў Бабруйску

БАБРУЙСК. (Наш кар.). Цэнтральны Камунбанк выдаў Бабруйскаму гарсавету 43 тыс. руб. на заканчэньне пабудовы вадаправоду ў Бабруйску. Большая частка будаўніцтва ўжо скончана. Паогул-жа вадаправод будзе гатовы ў лістападзе месяцы гэтага году.

Кантрактацыя яравых на Аршаншчыне

ВОРША. (Наш кар.). Да апошняга часу плян кантрактацыі па ільнавалакне выкананы на 100 процантаў, па ільнонасеньні—на 110 процантаў, па ячмені—на 80 процантаў, па бульбе—на 51 проц. Асабліва добра выконваецца плян па кантрактацыі ў Талачынскім, Ляднянскім, і Багушэвіцкім раёнах, вусім слаба — у Расьнянскім, Аршанскім і Кохнаўскім раёнах.

15 мільёнаў руб. на будаўнічыя работы

ГОМЕЛЬ. (Наш кар.). На будаўнічыя работы па акрузе ў 1929-30 годзе па пляну мае быць выдана 15.124.420 руб. З гэтае сумы на прамысловае будаўніцтва адпускаецца 2.553.200 руб., гандлёвае—2.115 тыс. руб., жыльлёвае—2.115 тыс. руб., школьнае—1.742.700 р. і інш. Плянам прадугледжана таксама пабудова новых памяшканьняў для сельсаветаў.

Акруговы зьезд прафсаюзаў

ВОРША. (Наш кар.). Адкрыўся пяты акруговы зьезд прафсаюзаў акругі. Усяго на зьезд зьявілася 94 дэлегаты. Зьезд заслухае даклад ЦСПСБ, акруговага бюро прафсаюзаў, даклад страхкасы і акруговай інспэкцыі аховы здароўя, даклад аб становішчы і пэрспэктывах разьвіцьця прамысловасьці Аршанскае акругі.

У Савеце Народных Камісараў

Ушчыльненьне і перасяленьне ў дамох

У зьвязку з наяўнасьцю вострага жыльлёвага крызісу, для больш рацыянальнага скарыстаньня жыльлёвай плошчы ў гарадох БССР, СНК прыняў пастанову аб ушчыльненьні і перасяленьні ў муніцыпалізаваных і прыватных дамох.

Паводле гэтай пастановы трэба правесьці ўшчыльненьне ў тых выпадках, калі грамадзяне займаюць жылую плошчу, большую за 9,1 кв. мэтраў на кожнага члена сям'і, або большую за норму, прадугледжаную асобнымі законамі. Калі ў кватэры, апрача нормы жылое плошчы, ёсьць лішні пакой, які мае асобны выхад на вуліцу, то камунальныя аддзелы, ЖАКТ'ы, домакіраўніцтвы і прыватныя домаўласьнікі павінны не пазьней, як праз месяц пасьля выданьня гэтай пастановы, здаць такі пакой працоўнаму, папярэдзіўшы аб гэтым наймальніка кватэры не пазьней, як за 5 дзён да здачы. Калі такога пакою няма, то лішняя плошча павінна быць здана наймальнікам кватэры працоўнаму па сваім выбары. Калі лішняя плошча ня будзе заселена ва ўстаноўлены тэрмін, то гэтая плошча ва ўсіх дамох засяляецца па ордэрох камунальнага аддзелу.

Для больш правільнага разьмеркаваньня лішняй жылой плошчы, ЖАКТ'ы і камунальныя аддзелы маюць права перасяляць жыльцоў з кватэры ў кватэру і з дому ў дом (у дамох жакТаў і ў кватэрах, якія забраніваны за камгасам).

Грамадзянам, якія перасяляюцца, павінны даваццa памяшканьні, годныя для жыцьця, прыблізна з такімі самымі камунальнымі паслугамі, якія былі ў тэй кватэры, з якое яны пераселены.

Падрыхтоўка да ўсебеларускай выстаўкі сельскай гаспадаркі і прамысловасьці

СНК зацьвердзіў каштарыс 1-й усебеларускай выстаўкі сельскай гаспадаркі і прамысловасьці. Агульны кошт выстаўкі і млн. руб.

Менскаму гарсавету даручана ўключыць у свой каштарыс выдаткі на ўсе мерапрыемствы, зьвязаныя з дабрабытам на тэрыторыі выстаўкі (трамвай дарога да балотнай станцыі і інш.). Усім наркаматам, цэнтральным установам і акрвыканкомам запрапанавана шырэй разгарнуць кампанію да падрыхтоўкі да выстаўкі. Упоўнаважанаму НК Шляхоў пры СНК БССР даручана паклапаціцца аб дармовым праезьдзе на чыгунках і рэках у межах БССР экскурсій сялян, рабочых і чырвонаармейцаў, а таксама аб сваячасовай падачы вагонаў для экспанатаў, аб правозе іх на выстаўку па паніжаным тарыфе.

Водпуск старшыні СНК т. Галадзеда

СНК даў з 10 чэрвеня г. г. 2-хмесячны водпуск старшыні СНК т. М. М. Галадзеду. Выкананьне абавязкаў старшыні СНК на час водпуску т. Галадзеда ўскладзена на нам. старшыні СНК т. Карклі-на, М. М.

НАЗНАЧЭНЬНІ

З прычыны пераходу т. Гаўзэ на навуковую працу, СНК задаволіў яго хадайніцтва аб звольненьні з яго абавязкаў рэдактара-кансультанта СНК і Эканамічнай Нарады і назначыў рэдактарам-кансультантам т. Фрыдмана, І. Н.

МЕНСК

Вячэрнія вытворчыя курсы ў саўгасах і лясьніцтвах

Прэзыдыум ЦП саюзу сельгаспрацоўнікаў арганізуе ў 123 саўгасах трохтыднёвыя вячэрнія вытворча-тэхнічныя курсы, праз якія будзе прапушчана 2 тыс. рабочых.

14 курсаў па перакваліфікацыі аб'ездчыкаў арганізуецца ў лясьніцтвах.

Адначасова прэзыдыум ЦП вынес пастанову аб арганізацыі вячэрніх вытворчых курсаў у 8-мі пунктах торфараспрацовак—Гомлі, Асінстрої, на Эльводзе і г. д. Курсы разьлічаны, галоўным чынам, на абслугоўваньне батракоў і членаў саюзу сельгаспрацоўнікаў.

Аварыі на вадаправодзе

Вялікія маразы мінулай зімы вельмі папсавалі Менскі вадаправод. Зямля прамерзла на 2 з паловай мэтры і яшчэ дагэтуль па некаторых мясцох не расстала і таму допаюцца трубы. За адзін толькі май месяц у горадзе было 109 аварый. Аварыі тлумачацца яшчэ тым, што вадаправодная сетка ўжо даўно не рамантавалася. Па прычыне гэтых аварый многія раёны гораду часта застаюцца без вады. Эльвод мабілізаваў усе тэхнічныя сілы для ліквідацыі аварый.

За дзень

ПАРАД У ЛЯГЕРАХ. 9-га чэрвеня ў лягерах Беларускай дывізіі адбудзецца вялікі парад у зьвязку з адчыненьнем гэтых лягераў. Парад будуць прымаць члены ўраду БССР на чале з т. ЧАРВЯКОВЫМ.

ЧЫСТКА БІРЖЫ ПРАЦЫ. Сэкцыя РСІ гарсавету вылучыла 12 дэпутатаў і 6 дэлегатаў для ўдзелу ў чыстцы беспрацоўных і апарату Біржы працы. На Біржы працуе спэцыяльная камісія.

ЧАСОВАЕ ЗАКРЫЦЬЦЕ РАДЗІЛЬНАГА ДОМУ. У зьвязку з рамонтам часова закрыты першы радзільны дом. Хворыя будуць абслугоўвацца цэнтральным радзільным домам і акушэрскім аддзяленьнем 2-ой больніцы.

ВЯЧЭРНІЯ ДЗЯЖУРСТВЫ Ў КАМГАСЕ. У Менскім камгасе распачаўся прыём кватэрнай платы з жыхароў камунальных дамоў з 9-ці гадзін раніцы да 1-й гадзіны дня і з 6-ці да 8-мі гадзін увечары.

Пабудуем самалёт „Рабселькор" і танк імя В. І. Ульянавай

Рэдкалегія ўкраінскай газэты «ЗАВОДЗКІ ГУДОК» (Мазыр) ад імя рабкораў і чытачоў уносіць ДАДАТКОВА 35 руб. (усяго ўнесена 135 р.).

***

Рэдкалегія насьценгазэты «НАШ БЫТ» (групком № 2, хлебная інспэкцыя) па выніку насьценгазэты групкому № 4 уносіць 5 руб. 50 кап.

Пачынаецца чыстка апарату Біржы працы

Сёньня, 8-га чэрвеня, а 5-й гадзіне дня ў памяшканьні Біржы працы (Заля вытворчай сэкцыі) адбудзецца адкрытае пасяджэньне камісіі па чыстцы апарату Біржы і беспрацоўных разумовай сэкцыі.

Чыстку праходзяць:

Загадчык Біржай працы—т. ДУМЛЕР, сакратар—т. САБЕШУК, загадчык вытворчай сэкцыяй—т. ДЗЯМІДОВІЧ, дзелавод вытворчай сэкцыі—тав. КАСЬЦЮК, загадчык разумовай сэкцыі—т. ТАРАСАЎ, загадчык сэкцыі чорнарабочых т. ГРУНЕЦКІ, дзелавод—т. МАРКЕВІЧ, загадчык сэкцыі будаўніноў—т. РАДЗІЁНАЎ, загадчык Беларускім аддзяленьнем цэнтрапасрэдрабіоў—т. ПРАГІН, загадчык юносэкцыі—т. КАПЛАН.

Камісія просіць усіх рабочых, служачых і беспрацоўных прыняць актыўны ўдзел у рабоце па чыстцы.

— ДОМ АСЬВЕТЫ. Сёньня 8/VI а 7-й гадзіне адчынены сход яч. ЛКСМБ працасьветы.

Парадак дня: зацьвярджэньне плянаў працы ячэйкі.

1-ы ўсебеларускі зьезд бязбожнікаў

50 дэлегатаў, 50 барацьбітоў з рэлігійным дурманам, прадстаўнікоў шматтысячнай армі бязбожнікаў БССР, зьехаліся ў Менск на ўсебеларускі зьезд. Першы раз за ўвесь час існаваньня саюзу беларускія бязбожнікі сабраліся, каб арганізаваць ў рэспубліканскім маштабе, каб падзяліць практыкай работы і намеціць мэтады і формы далейшай барацьбы з клясавым ворагам у «сьвятой» вопратцы. Дагэтуль работа бязбожнікаў вялася слаба, кожная акруга працавала асобна, мела свае мэтады работы. Аднак, усе акругі сходзіліся ў адным: сыстэматычнай антырэлігійнай работы нідзе не вялося, антырэлігійная прапаганда насіла стыхійны, кампанейскі характар і праводзілася звычайна перад сьвятамі.

— 1-шы ўсебеларускі зьезд бязбожнікаў павінен пакласьці пачатак сыстэматычнай масавай антырэлігійнай рабоце — сказаў ва ўступным слове пры адкрыцьці зьезду старшыня саюзу бязбожнікаў тав. **Матулайціс.** Нашы ворагі робяць усё магчымае, каб прасунуць свае «ідэі» ў працоўныя масы. Яны выкарыстоўваюць усе магчымасьці для вярбоўкі ў цэрквы і сэкты адсталых груп рабочых і сялян. Мы павінны павесьці самую рашучую барацьбу з клерыкалізмам, з рэлігійным дурманам.

Пад гучныя воплескі зьезд абірае ў ганаровы прэзыдыум членаў палітбюро ЦК УсеКП(б), членаў бюро ЦК КП(б)Б і тав. Яраслаўскага.

З невялікім справаздачным дакладам аб рабоце саюзу бязбожнікаў выступіў тав. **Матулайціс.**

Дакладчык адзначае, што да гэтага часу сыстэматычнай антырэлігійнай работы ў Беларусі не вялося. Бязбожнікі да апошняга часу на мелі сродкаў і ня мелі пават тэхнічнага працаўніка і сталага месца працы. Ня было вучоту, дагэтуль яшчэ не ўдалося выдаць належнай літаратуры.

За апошнія месяцы становішча аднак, некалькі палепшылася. Наркамасьветы адпусьціў пэўную суму для антырэлігійнай работы.

Бязбожнікі правялі вялікую антырэлігійную кампанію.

Гэтымі днямі адкрываюцца ўсебеларускія курсы па падрыхтоўцы антырэлігійных працаўнікоў.

Нарэшце, вялікае дасягненьне—самы ўсебеларускі зьезд бязбожнікаў. На ім будзе прынят статут саюзу.

Тав Матулайціс паказвае на неабходнасьць наладзіць цесную сувязь з акругамі, завербаваць актыў бязбожнікаў.

Тав. **Некрашэвіч** адзначыў вялікае значэньне зьезду, які пакладзе пачатак сталай сыстэматычнай рабоце арганізацыі бязбожнікаў.

Першае пасяджэньне зьезду закрылася выступленьнем раду дэлегацый, віталіўшых зьезд.

Ад імя рабочых «Эльводу» зьезд віталі тав. **Панькоў**, ад чыгуначнікаў—тав. **Панасюк**, ад рабочых Асінбуду—тав. **Кулік.** З прывітаньнямі выступалі яшчэ дэлегацыі ад юных бязбожнікаў 6-й польскай школы, ад 2.000 чал.—членаў саюзу нархарч, ад студэнтаў Менскага рабфаку, ад вучняў 9-й савецкай школы.

Кожны дэлегат апавядаў аб дасягненьнях сваёй ячэйкі «Бязбожнік», аб росьце ліку членаў ячэйкі, аб актыўнасьці і г. д.

Вялікую зацікаўленасьць зьезду выклікала выступленьне з прывітаньнем ад імя сялян Бабруйшчыны—68-гадовага бязбожніка—селяніна **Івашка.**

— Няма чаго глядзець на неба—кажа стары прамоўца—у гэтым мы ўпэўніліся. Нас стагодзьдзямі ашуквалі.

Зараз мы кажам: ты, бог, сядзі сабе на небе, а мы на зямлі будзем рабіць, што хочам.

***

Зьезд прыняў адозву да працоўных БССР аб барацьбе з рэлігійным дурманам.

Супроць багоў і чарцей

Адозва зьезду да ўсіх членаў саюзу бязбожнікаў і ўсіх працоўных Савецкай Беларусі

Таварышы! З усіх куткоў нашай Савецкай Беларусі сабраліся ў Менск бязбожнікі на свой першы зьезд для вырашэньня вельмі важных і цяжкіх задач барацьбы за новага чалавека, за новае разумнае культурнае жыцьцё працоўных.

У той час, калі пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі ў нашай савецкай краіне ўсё больш шырока разгортваецца гаспадарчае і культурнае будаўніцтва ў горадзе і на вёсцы, калі на нашых вачох шматмільённыя колы рабочае клясы і працоўнага сялянства ўсё больш актыўна выступаюць для перабудаваньня свайго жыцьця на новым сацыялістычным грунце, у той час, калі патрэбна моцная братэрская згуртаванасьць працоўных усіх народаў—у гэты самы час на цяжкім шляху нашай будаўнічай працы мы сустракаем старых ворагаў, якія актыўна перашкаджаюць усім мерапрыемствам партыі і савецкай улады.

Нэпман, кулак, гандляр, спэкулянт—усе гэтыя хаўрусьнікі, адчуваючы, што ўсё бліжэй і бліжэй падыходзіць іх пагібель, усё больш актыўна супрацьпяюцца, дамагаюцца захаваць рэшткі старога сьвету.

У сваёй барацьбе супроць дыктатуры пралетарыяту, супроць сацыялістычнага будаўніцтва, яны маюць верных і адданых памочнікаў: папоў, ксяндзоў, рабінаў, сэктантаў і іншых «сьвятых» братоў, якія праз цэрквы, касьцёлы, сынагогі імкнуцца адцягнуць увагу працоўных ад сваіх кроўных, жыцьцёвых інтарэсаў. Яны хочуць зацікавіць працоўныя масы небам, богам, пужаюць працоўных «страшным судом на тым сьвеце», каб паспабіць іх энэргію ў барацьбе за свае патрабаваньні.

«Сьвятыя айцы» сеюць нацыянальную нянавісьць паміж працоўнымі масамі розных нацыянальнасьцяй, каб парваць іх братэрскі саюз.

Таварышы! Першы зьезд саюзу бязбожнікаў БССР ад імя 50-тысячнай армії бязбожнікаў, паўстаўшых супроць багоў, чарцей, супроць папоў, ксяндзоў, рабінаў, супроць усёй «сьвятой брацыі», заклікае вас на барацьбу супроць рэлігіі, супроць папоўска-рабінскага ашуканства працоўных мас.

«Рай і пекла на тым сьвеце»—папоў, рабінам і ўсім сьвятым.

Лепшае жыцьцё на гэтым сьвеце—рабочым, сялянам і ўсім працоўным. С.

На барацьбу з сухотамі

Хутка пачнецца „сухотны" трохтыднёвік

15 чэрвеня пачынаецца «сухотны» трохтыднёвік па Менскай акрузе.

Барацьбу з сухотамі праводзяць у нас дзяржаўны сухотны інстытут і Менскі сухотны дыспансэр. Гэтыя дзьве ўстановы ўпарта змагаюцца за аздараўленьне працы і быту рабочага і селяніна. **Савет сацыяльнай дапамогі** пры дыспансэры наладзіў цесную сувязь з заводамі і фабрыкамі, уцягваючы ў барацьбу з сухотамі шырокую рабочую грамадзкасьць. Савет праводзіў сыстэматычную прафіляктычную работу на радзе менскіх прадпрыемстваў. Сотні рабочых прайшлі праз мэдычны агляд, шмат з іх накіраваны ў санаторы. На гэтых-жа прадпрыемствах чыталіся лекцыі аб барацьбе з сухотамі. На пленумах савету сацыяльнай дапамогі дактары, прымацаваныя да прадпрыемстваў, і рабочыя, вылучаныя у савет, рабілі справаздачы аб сваёй дзейнасьці і высунулі рад прафіляктычных мерапрыемстваў.

Савет сацыяльнай дапамогі за мінулы год забясьпечыў амаль усіх хворых на сухоты кішэннымі плявальніцамі, раздаў 14 шурак дроў, выдаваў рыбін тлушч, трымаў 5 дадатковых ложкаў у санаторы «Навінка».

Шырокія прафіляктычныя і лекавыя мерапрыемствы, праведзеныя сухотнымі арганізацыямі, далі некаторыя вынікі.

Лічбы гавораць аб сыстэматычным паданьні сьмяротнасьці ад сухот. У 1924 г. памёр 361 ч., у 1925 г.—224 ч., у 1926 г.—190, у 1927 г.—152, у 1928 г.—136

У часе трохтыднёвіка наладжваецца скарбопачны збор і мітынгі на плошчах і рынках. У клюбах, садах і на прадпрыемствах будуць прачытаны лекцыі пра сухоты. Выпускаецца спэцыяльная газэта аднаднёўка.

На прадпрыемствах рабочыя-члены савету сацыяльнай дапамогі—выступяць з дакладамі аб дзейнасьці савету. О. К.

6-я нарада ваенкораў БВА

У Смаленску скончылася акруговая нарада ваенкораў Беларускай вайсковай акругі. На нарадзе шмат увагі ўдзелена было рабоце насьценгазэт і пытаньням кіраўніцтва ваенкорамі. Выступаўшыя ваенкоры адзначылі, што партыйнае кіраўніцтва ваенкораўскім рухам у часьцях невыстарчальнае, што рост кіраўніцтва адстае ад росту ваенкораўскага руху і яго патрэб.

Шмат спрачаліся наконт мэтаўгоднасьці выпуску шмат тыражных друкаваных насьценгазэт. Большасьць выказалася супроць друкаваньня газэт, бо гэта выклікае вялікія выдаткі і перашкаджае падрыхтоўцы ўсёй работы да баявой абстаноўкі.

Перад апошнім пасяджэньнем усе ўдзельнікі нарады вышлі ў поле для вырашэньня тактычных задач і пісаньня аб іх заметак.

Нарада пастанавіла арганізаваць масавы кантроль рэагаваньня ўстаноў на заметкі ваенкораў.

Нарада прызнала, што ваенкор павінен ня толькі крытыкаваць, выкрываць недахопы ў часьцях і ў грамадзянскіх арганізацыях, але і дапамагаць сваімі ведамі і ўказаньнямі камандаваньню і арганізацыям вынішчаць гэтыя недахопы. Ваенкоры павінны быць лепшай часткай чырвонаармейскага актыву. Б.

ПАВЕДАМЛЕНЬНІ

— САД АСЬВЕТЫ. Сёньня гуляньне, канцэрт і кіно. Пачатак а 6 гадз. Білеты ад 20—25 к.

У нядзелю, 9 чэрвеня, а 11 гадзіне дня, у Доме Працаўнікоў Асьветы (Камуністычная вул. д. № 19, пакой № 4), адбудзецца канфэрэнцыя кравзнаўчых гурткоў школ гораду Менску.

Парадак канфэрэнцыі:

1. Інфармацыя гурткоў аб праробленай працы.
2. Разгляд інструкцыі Менскага акруговага т-ва кравзнаўства—«Арганізацыя і зьмест працы школьна-кравзнаўчых гурткоў».
3. Абмеркаваньне заданьняў на лета.

Прысутнасьць усіх сяброў гурткоў абавязкова. Запрашаецца настаўніцтва і піянэр-працаўнікі.

— САД САЮЗУ СЕЛЬГАСЛЕСРАБОЧЫХ—кіно-сад «Чырвонная Зорка» (Савецкая, 71). Члены саюзу СГАР атрымліваюць зьніжэньне на білеты ў кіно-сад «Чырвоная Зорка» у разьмеры 30 проц. (пры прад'яўленьні прафсаюзнага білету паказанае зьніжэньне робіцца на 2 білеты ў кіно).

Па панядзелках: з 12 да 4-х гадзін дня ў садзе адчынена чытальня з часопісамі, газэтамі, шахматамі і іншымі іграмі; з 6-ці да 9-ці гадзін вечару—чытальня, а з 9-ці гадзін вечару—бесплатны кіно-сеанс для членаў саюзу і іх трымальцаў. Уваход па прафсаюзных білетах.

Адказны рэдактар ЯН. АСЬМОЎ

ТЭАТР і КІНО

БЕЛДЗЯРЖТЭАТР

Субота, 8 чэрвеня.) — (для саюзу гарбароў

ІНГА

Пачатак а 8 з палов. гадз. увечары.

СЁНЬНЯ, 8 ЧЭРВЕНЯ,

Гастролі

ДЗЯРЖЦЫРКУ

Пачатак прадстаўленьня роўна а 9 гадзіне ўвечары.

У нядзелю, 9 чэрвеня

1-шы ГРАНД. ДЗІЦЯЧЫ РАНІШНІК

ПА ЗЬНІЖАНЫХ ЦЭНАХ. | Пачатак а 2 г. дня.

ДЗЕЦІ пры дарослых праходзяць ДАРМОВА

КІНО-ТЭАТР „Культура" — Новы мастацкі баявік ЛЯСНЫ ЧАЛАВЕК — Пачатак а 8 гадзіне ўвечары.

Кіно-сад ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА Савецкая, 71. — Новы мастацкі фільм, выт. Белдзяржкіно 400 мільёнаў — Пачатак 1-га сэансу а 9 гадз.

КІНО Інтэрнацыянал — Бытавы фільм За чужыя грахі — Пачатак 1-га сэансу а 7 з пал. гадз. увеч.

КІНО Пралетары — Мастацка-гістарычны фільм СЫГНАЛ З МОРА — Пачатак а 7 з пал. г. Каса—ад 6 г.

КІНО Спартак — Адна з лепшых карцін вып. „Межрабпом—фільм" мастацкая драма" у 6 част. СОРАК ПЕРШЫ — ЗВЫШ ПРАГРАМЫ ВЫСТУПАЮЦЬ — зыкан. інтымных жанраў і дзіцячых сьпеваў — Н. В. Ронская — выкон. акорыя. эксцэнтрыкі і характ. танцаў — Д. М. Стоянаў — Каса—ад 6 гадз. Пачатак—а 7 г. 30 м.

Прыймо абвестак у чарговы нумар газэты адбываецца да 2-ое гадзіны дня

Для аграпунктаў, хат-чытален, нардамоў, с.-г. гурткоў, сялян дасьледчыкаў, саўгасаў, калгасаў, грамадзкіх арганізацый і сялян ва ўсіх кнігарнях Белдзяржвыдавецтва, ва ўсіх Спажывецкіх таварыствах

ПРАПАНУЮЦЦА НАСТУПНЫЯ КНІГІ:

1. Аляксееў—Сэрадэля—трава на кори і ўгнаеньне. 1928 г. Стар. 64. Цана 18 кап.
2. Баранава—Як сеяць лугавыя травы. 1928 г. Стар. 32. Цана 13 кап.
3. Бахцееў—Попел, як угнаеньне. 1929 г. Стар. 24. Цана 10 кап.
4. Грабоўскі—Аб насеньні, выд. II. 1928 г. Стар. 64. Цана 10 кап.
5. Заяц—Ачышчэньне зерня—шлях да павялічэньня ўраджайнасьці. 1929 г. Стар. 32. Цана 10 кап.
6. Качаткоў—Хэмія на службе селяніну. 1929 г. Стар. 48. Цана 15 кап.
7. Львоў—Сялянскі пладовы і ягадны сад. 1929 г. Стар. 68. Цана 25 кап.
8. Мансьветаў—На што хварэюць куры і як іх лячыць. 1928 г. Стар. 42. Цана 5 кап.
9. Мінц—Зялёныя фабрыкі. 1929 г. Стар. 48. Цана 15 кап.
10. Пакроўскі—Азімы чарвяк і барацьба з ім. 1928 г. Стар. 24. Цана 17 кап.
11. Перафярковіч—Што загатаўляць для продажу заграніцу. 1929 г. Стар. 64. Цана 20 кап.
12. Пракапенка—Канюшына, выд. II. 1929 г. Стар. 56. Цана 15 кап.
13. Рыбакоў—Кантрактацыя. 1929 г. Стар. 64. Цана 20 кап.
14. Рыбакоў—Машыновыя таварыствы, іх арганізацыя і работа. 1929 г. Стар. 108. Цана 30 кап.
15. Сто пудоў ураджаю з дзесяціны. 1928 г. Стар. 76. Цана 10 кап.
16. Сьпічэнка—Як загатаўляць сельска-гаспадарчыя прадукты. 1928 г. Стар. 64. Цана 15 кап.
17. Цярохін—Пладовыя гадавальнікі. 1929 г. Стар. 80. Цана 20 кап.
18. Чэмелаў—Як гадаваць насеньне кармовых кораньплодаў. 1928 г. Стар. 32. Цана 17 кап.
19. Шыбко—Скарыстаньне балота, выд. II-е. 1928 г. Стар. 58. Цана 15 кап.
20. Рэго—Ці можа перарадзіцца збожжа. 1929 г. Стар. 24. Цана 8 кап.
21. Лайкоў—Якія шматпольныя севазвароты раіць часоп. «Плуг» для сялян Беларусі. 1929 г. Стар. 88. Цана 20 кап.
22. Бахцееў—Як працаваць на асушаным балоце. 1929 г. Стар. 48. Цана 18 кап.
23. Аляксееў—Зялёнае лубінавае ўгнаеньне на Беларусі, 1929 г. Стар. 96. Цана 30 кап.
24. Гарбуз—Як арганізаваць калектыўную гаспадарку. 1929 г. Цана 6 кап

БЕЛДЗЯРЖВЫДАВЕЦТВА.

АДПУСКНІКІ!

НЕ ЗАБУДЗЬЦЕСЯ ПЕРАД АДЫХОДАМ — У ВОДПУСК ПАВЕДАМІЦЬ У — кантору газэты „ЗЬВЯЗДА" Савецкая, 63 тэл. 7-81

ВАШ НОВЫ АДРАС.

Вам будзе пасылацца «ЗЬВЯЗДА» па месцы знаходжаньня ў водпуску

без асобнай даплаты за перамену адрасу.

Кошт публікацыі 50 К. аб згубе дакумэнту

Згубленыя і ўкрадзеныя дакумэнты лічыць несапраўднымі

Асоб. картка Бурылава М., выд. Расонск. РВК. 449
Віза Пікус Л. Н., выд. Магільнянск. сельсаветам. 450
Асоб. картка Фрыдляндз З., выд. Менраенкаматам. 451
Метрычнае пасьведч. № 26 Стапкевіча М. Г., выд. Халопеніцк. РВК. 452
Вучотна-конская кніжка № 3.303 Касанава В., выд. 4-м в.-к. вуч. Мазырск. акр. 470
Канцэрац. кніжка № 927 Пятрушэнка К. П., выд. Калінкавіцкім ТПО. 471
Вуч.-конск. картка Макарэнкава Е. М., выд. Чавускім ваенадзелам. 472
2 вэксалёвыя бланкі на 100 руб. з подпісам Гарбаткіна Н. 473
Вуч.-конская картка Машарскага П., выд. Расонск. РВК. 474
Вуч.-конская картка Грыбава А. П. 475
Асабовая кніжка Вежыка Ф. П., выд. Лепельск. РВК. 476
Вуч.-конская кніжка № 1.554 Коркуца Ф. Г., выд. Нараўлянск. РВК. 477

Гр. КАНЬКОЎ ХАРЫТОН ЛОГГІНАВІЧ, які находзіць з гр. вёскі Малая Цербахуны, Запольскага сельсав., Суражскага раёну, Віцебск. акр., і знаходзіцца ў г. Віцебску, інтэрнат 1 узводу 3 раёну аховы МББ чыгункі, зьмяняе прозьвішча „Канькоў" «на КАЛІНСКІ»

Асоб, якія маюць перашкоды да замены прозьвішча, просяць паведаміць у Віцебскі ЗАГС, паказаўшы сваё імя, імя па бацьку, прозьвішча і месца жыхарства

БАБРУЙСКАМУ АКРКАЛГАССАЮЗУ

ПАТРЭБЕН ТЭХНІК,

які-б ведаў сельска-гаспадарчае будаўніцтва

Асоб, што жадаюць заняць гэтую пасаду, акркалгассаюз запрашае асабіста або пісьмова падаць аб гэтым заяву. Пэнсія па ўмове, прыблізна каля 150 руб. у месяц.

У ВЫПАДКУ НЕАКУРАТНАЙ дастаўкі газэты „ЗЬВЯЗДА" вазнеце па тэл. 2-49

ЗЬВЯЗДА

ФОТО-ЦЫНКАГРАФІЯ ПРЫМАЕ ЗАКАЗЫ НА КЛІШЭ

МАСТАЦКАЕ ВЫКАНАНЬНЕ РЫСУНКАЎ

З ЗАКАЗАМІ ЗВАРОЧВАЦЦА У ГАЛОЎНУЮ КАНТОРУ ГАЗЭТЫ „ЗЬВЯЗДА"-МЕНСК, САВЕЦКАЯ, №63, 3ці ПАВЕРХ.

ПАРТРЭТЫ, ГРАВЮРЫ, ПЛЯНЫ, СХЭМЫ, ФАКСІМІЛЕ, ЭТЫКЭТЫ, ЦЭННІКІ, ВОКЛАДКІ, ВІНЬЕТКІ, РЭКЛЯМНЫЯ ПЛЯКАТЫ і іншыя МАСТАЦКІЯ РАБОТЫ.

Згодна пастановы прэзыдыуму ЦСПСБ ад 7 сакавіка 1929 г. пратакол № 9/63

пры Інстытуце Аховы Працы АРГАНІЗУЕЦЦА

КАНСУЛЬТАЦЫЯ ПА ПЫТАНЬНЯХ АХОВЫ ПРАЦЫ І САЦЫЯЛЬНАГА СТРАХАВАНЬНЯ.

Першая калектыўная кансультацыя па пытаньні аб дадатковых адпусках адбудзецца ў суботу, 8 чэрвеня 1929 г. а 6 гадзіне ўвечары, у памяшканьні Інстытуту Аховы Працы (рог вул. Карла Маркса і Энгельса, дом № 44|23 супроць Дзяржтэатру)

Уступны даклад дырэктара інстытуту С. Р. Дзіхцяра.

Запрашаюцца прадстаўнікі фабзаўкомаў, камісіі па ахове працы, ВСНГ, трэстаў.

КА ЦСПСБ, Інстытут Аховы Працы

Цэнтральнае праўленьне саюзу саўгандальслужачых сумесна з рэдакцыяй „Наша Газета" 9 чэрвеня г. г. а 7 гадз. увечары ў памяшканьні клюбу САЎГАНДАЛЬСЛУЖАЧЫХ СКЛІКАЕ

ЧЫТАЦКУЮ КАНФЭРЭНЦЫЮ „НАШЕЙ ГАЗЕТЫ"

У ПАРАДКУ ДНЯ: 1) Дакład рэдакцыі „Наша Газета"; 2) выбары арганізатара рабкораў; 3) разгляд палажэньня аб арганізатарах рабкораў і 4) бягучыя справы.

На данную канфэрэнцыю запрашаюцца ўсе чытачы «Н. Г.», рэдкалегіі насьценгазэт, сьценкоры, рабкоры «Н. Г.» і іншых газэт, а таксама ўсе сябры нашага саюзу.

Бел. бюро сэкцый гандлевых служачых пры ЦП саюзу саўгандальслужачых і Бел. бюро аб'яднаньня работнікаў вучоту СКЛІКАЮЦЬ 10 чэрвеня а 7 гадз. увеч. у клюбе саўгандальслужачых

СУМЕСНАЕ ПАСЯДЖЭНЬНЕ Б